Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА
# БІБЛІЯГРАФІЯ

*Праграмы да ўступных іспытаў па спецыяльнасці 1–23 01 11 "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" (па напрамках) для паступаючых у УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” на скарочаны тэрмін навучання*

Мінск 2009

**Праграму па “Бібліятэказнаўстве” распрацавалі:**

*Н.У.Клімянкова*, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

*Н.А.Ляйко,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

*Н.Я.Петушка,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў

**Праграму па “Бібліяграфіі” распрацавалі:**

*С.В.Зыгмантовіч,* кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

*В.А.Касап,* кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

*В.І.Саітава,* кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

Агульная рэдакцыя – Л.Ф. Голікава.

Праграмы зацверджаны прыёмнай камісіяй установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №1 ад 16.02.2009 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ

**БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА**

**Праграма для паступаючых на скарочаны тэрмін навучання на ФІДК і ФЗН** ........ 4

**Раздзел 1** *Бібліятэказнаўства: тэарэтычныя і арганізацыйныя пытанні* ........ 4

**Раздзел 2** *Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк* ........ 8

**Раздзел 3** *Бібліятэчны маркетынг і бібліятэчны менеджмент* ........ 15

**Раздзел 4** *Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў* ........ 18

**СПІС ЛІТАРАТУРЫ** ........ 26

**БІБЛІЯГРАФІЯ**

**Праграма для паступаючых на скарочаны тэрмін навучання на ФІДК у межах функцыянавання сістэмы бесперапыннай падрыхтоўкі «тэхнікум - ВНУ»** ........ 29

**Раздзел 1** *Бібліятэказнаўства: тэарэтычныя і арганізацыйныя пытанні* ........ 30

**Раздзел 2***Інфармацыйныя рэсурсы* ........ 31

**Раздзел 3** *Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнай работы бібліятэкі* ........ 36

**Праграма для паступаючых на скарочаны 4-х гадовы тэрмін навучання на ФЗН пасля заканчэння бібліятэчнага тэхнікума** ........ 42

**Раздзел 1** *Дакументазнаўства* ........ 43

**Раздзел 2** *Бібліяграфазнаўства: тэарэтычныя патанні* ........ 45

**Раздзел 3** *Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнай работы публічных бібліятэк* ........ 49

**Раздзел 4** *Спецыяльнае бібліяграфазнаўства* ........ 56

**СПІС ЛІТАРАТУРЫ** ........ 60

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА
## Праграма для паступаючых на скарочаны тэрмін навучання на ФІДК і ФЗН

Праграма да ўступных іспытаў для абітурыентаў ФІДК і ФЗН па “Бібліятэказнаўстве” падрыхтавана ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам “Сярэдняя спецыяльная адукацыя. Спецыяльнасць 2-23 01 31 “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія” і праграмай па “Бібліятэказнаўстве” для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці 2–23 01 31 “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія”, распрацаванай выкладчыкамі УА "Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны тэхнікум імя А.С.Пушкіна”.

Праграма складаецца з 4 раздзелаў: бібліятэказнаўства: тэарэтычныя і арганізацыйныя пытанні; абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк; бібліятэчны маркетынг і бібліятэчны менеджмент; арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў.

Пры падрыхтоўцы да ўступных іспытаў абітурыентам неабходна звярнуць увагу на: тэарэтыка-метадычныя пытанні сучаснага бібліятэказнаўства, прынцыпы дзейнасці і сацыяльныя функцыі бібліятэк, эвалюцыю ўяўленняў аб бібліятэцы як сістэме, арганізацыю бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў у краіне, тэхналогію і методыку фарміравання бібліятэчных фондаў і каталогаў, а таксама выкарыстанне маркетынгавых падыходаў у дзейнасці бібліятэк, інфармацыйную дзейнасць бібліятэк і асаблівасці іх функцыянавання ва ўмовах рынку.

Значную дапамогу ў засваенні праграмы можа аказаць спіс літаратуры.

Пры адказе на іспытах абітурыент павінен прадэманстраваць добрае валоданне дзяржаўнай мовай (рускай, беларускай), прафесійнай лексікай, уменне выкарыстоўваць веды, набытыя ў час вытворчай практыкі.

Іспыты праводзяцца ў вуснай форме. У білетах да іспытаў прапануюцца два пытанні з розных раздзелаў. Пры выстаўленні адзнакі за адказ выкарыстоўваюцца патрабаванні, выкладзеныя ў метадычных указаннях “Крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў на ўступных экзаменах”.

## Раздзел 1 БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ
### Агульнае ўяўленне аб бібліятэказнаўстве

Бібліятэказнаўства як навука аб тэорыі і практыцы бібліятэчнай справы. Структура бібліятэказнаўства. Састаўныя часткі бібліятэказнаўства:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыя і тэорыя бібліятэказнаўства, бібліятэчнае фондазнаўства, абслугоўванне карыстальнікаў, каталагізацыя дакументаў, бібліятэчны менеджмент і маркетынг, бібліятэчная прафесіяграфія і прафесіялогія. Месца бібліятэказнаўства ў сістэме сумежных галін ведаў, яго ўзаемадзеянне з іншымі навуковымі дысцыплінамі. Метады даследавання ў бібліятэказнаўстве. Выдатныя бібліятэказнаўцы Беларусі, краін СНД, далёкага замежжа.

### Прафесія бібліятэкара: кваліфікацыйныя патрабаванні

Адукацыйны стандарт "Спецыяльнасць 2-23 01 31 "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія". Кваліфікацыйныя характарыстыкі спецыяліста – бібліятэкара з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Прафесійныя, агульнаадукацыйныя і асобасныя якасці, неабходныя бібліятэкару. Уплыў сучасных інфармацыйных і сацыякультурных тэхналогій на прафесію бібліятэкара. Паняцце "прафесійная культура бібліятэкара". Інтэлектуальныя, маральныя, псіхалагічныя, тэхналагічныя кампаненты прафесійнай культуры бібліятэкара. Прафесійная этыка. Кодэкс прафесійнай этыкі бібліятэкара Беларусі.

### Прынцыпы дзейнасці і сацыяльныя функцыі бібліятэк

Асноўныя прынцыпы дзейнасці бібліятэк: прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей; садзейнічанне адраджэнню і развіццю культурных традыцый і захаванню каштоўнасцей беларускай нацыі, іншых нацыянальнасцей, якія пражываюць у краіне; распаўсюджванне гуманістычных ідэй, навуковых ведаў і дасягненняў сусветнай культуры; агульнадаступнасць інфармацыі аб змесце бібліятэчных рэсурсаў; самастойнасць у вызначэнні форм і метадаў дзейнасці па стварэнні і ўзаемавыкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў у мэтах задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэк.

Паняцце аб сацыяльных функцыях бібліятэк. Сутнасныя функцыі бібліятэк: кумулятыўная, мемарыяльная, камунікатыўная. Вытворныя функцыі бібліятэк: інфармацыйная, адукацыйныя, эстэтычная, рэкрэацыйная, геданістычная, сацыялізуючая, культурна-асветніцкая.

### Сетка бібліятэк Рэспублікі Беларусь

Агульныя падыходы да арганізацыі сеткі бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Закон "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь (рэдакцыя 2002 г.)" і "Палажэнне аб арганізацыі сукупнай сеткі бібліятэк Рэспублікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь" (1993 г.) як нарматыўна-прававая база фарміравання сеткі бібліятэк у краіне.

Віды бібліятэк. Па значэнні: нацыянальная, рэспубліканскія, абласныя, гарадскія, раённыя, пасёлкаў гарадскога тыпу, сельскія. Па прызначэнні: публічныя і спецыяльныя. Па зместу бібліятэчных фондаў: універсальныя, галіновыя.

## Дзяржаўная установа "Нацыянальная бібліятэка Беларусі"

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) – дзяржаўны інфармацыйны і сацыяльна-культурны цэнтр краіны.

НББ – універсальная бібліятэка, агульнадзяржаўнае сховішча нацыянальнага дакумента і "беларусікі", замежных дакументаў, якія маюць навуковую, культурную і мастацкую каштоўнасць. НББ як навукова-даследчая ўстанова па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве. Статут дзяржаўнай установы "Нацыянальная бібліятэка Беларусі" (2006 г.). Будынак бібліятэкі. Структура бібліятэкі.

Асноўныя функцыі бібліятэкі: фарміраванне фондаў, зберажэнне і захаванне дакументаў, стварэнне даведачна-бібліяграфічнага апарата, арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў, навукова-даследчая і метадычная работа, міжнароднае супрацоўніцтва, павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў.

## Універсальныя абласныя навуковыя бібліятэкі. Адметныя рысы. Змест дзейнасці

Месца універсальнай абласной навуковай бібліятэкі (УАНБ) у сістэме бібліятэчна-інфармацыйных устаноў рэгіёна. Статут бібліятэкі, яе структура. Асаблівасці фарміравання фондаў УАНБ. Сістэма абслугоўвання карыстальнікаў. УАНБ як цэнтр МБА, прававой інфармацыі насельніцтва, краязнаўчай дзейнасці, метадычнага забеспячэння бібліятэк вобласці, дэпазітарнага захавання бібліятэчных фондаў. Роля УАНБ у аўтаматызацыі інфармацыйна-бібліятэчных сістэм вобласці.

## Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк (ЦСДПБ). Цэнтральная бібліятэка (ЦБ). Задачы, функцыі, структура

Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк (ЦСДПБ) як аб'яднанне бібліятэк, функцыянуючае на аснове адзінага кіравання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульных фінансавых, матэрыяльна-тэхнічных, кадравых, інфармацыйных рэсурсаў і тэхналагічнага адзінства.

Цэнтральная бібліятэка (ЦБ) – інфармацыйны, культурна-асветніцкі, краязнаўчы, метадычны цэнтр горада (раёна).

Задачы, асноўныя функцыі, накірункі дзейнасці, структура ЦСДПБ і ЦБ. Праблемы аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў.

**Бібліятэкі-філіялы ЦСДПБ. Змест работы**

Адметныя рысы бібліятэк-філіялаў ЦСДПБ. Фарміраванне фонду з улікам інфармацыйных патрэб насельніцтва і культурна-эканамічных асаблівасцей зоны абслугоўвання. Змест работы. Індывідуальнае, групавое і франтальнае абслугоўванне карыстальнікаў. Спецыялізацыя бібліятэк-філіялаў. Бібліятэкі сямейнага чытання. Дзіцячыя бібліятэкі-філіялы: задачы, асноўныя функцыі, структура.

Новыя тыпы бібліятэчных установаў: бібліятэка-клуб, бібліятэка-музей, бібліятэка-відэатэка, бібліятэка-медыятэка, бізнэс-бібліятэка і інш. Прыкладнае палажэнне аб дзяржаўнай бібліятэцы-клубе.

Каардынацыя дзейнасці бібліятэк-філіялаў з іншымі арганізацыямі і ўстановамі.

**Спецыяльныя бібліятэкі**

Сацыяльнае прызначэнне спецыяльных бібліятэк і іх адметныя рысы. Віды спецыяльных бібліятэк: вучэбныя, вытворчыя, навуковыя. Сеткі спецыяльных бібліятэк. Бібліятэкі навучальных установаў: вышэйшых, сярэдніх, сярэднеспецыяльных. Асаблівасці карыстальнікаў, інфармацыйных рэсурсаў і функцыянавання. Бібліятэкі прадпрыемстваў і арганізацый, асаблівасці фарміравання фондаў і абслугоўвання карыстальнікаў. Навуковыя і навукова-тэхнічныя бібліятэкі – метадычныя цэнтры бібліятэчнага абслугоўвання адпаведнай галіны: спецыфіка фарміравання інфармацыйных рэсурсаў і абслугоўвання карыстальнікаў. Праблемы міжбібліятэчнага ўзаемадзеяння ва ўмовах інфарматызацыі. Бібліятэчныя кансорцыумы і іншыя аб’яднанні.

**Міжнароднае бібліятэчнае супрацоўніцтва**

Развіццё міжнароднага бібліятэчнага супрацоўніцтва на сучасным этапе. ББА і яе роля ў арганізацыі міжнароднага бібліятэчнага супрацоўніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЮНЕСКА – агульныя звесткі і напрамкі дзейнасці. Праграмы: “Памяць свету”, “Памяць Беларусі”, “Інфармацыя для ўсіх”, “Маніфест ЮНЕСКА аб публічных бібліятэках”.

ІФЛА – міжнародная федэрацыя бібліятэчных асацыяцый. Мэта, дзейнасць, праграмы. “Электронная Еўропа”, “Маніфест аб Інтэрнэце”. Міжнародная федэрацыя па дакументацыі. Міжнародная арганізацыя па стандартызацыі. Агульныя звесткі, напрамкі дзейнасці.

Бібліятэчная асамблея Еўразіі. Асноўныя напрамкі дзейнасці. “Мадэльны бібліятэчны кодэкс СНД”.

Напрамкі міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне бібліятэчнай справы: набыццё інфармацыйных рэсурсаў і абмен імі, удзел у рабоце міжнародных арганізацый, у рэалізацыі міжнародных праектаў, правядзенне міжнародных сустрэч, канферэнцый, семінараў, стажыроўкі і вучоба супрацоўнікаў у бібліятэках замежных краін.

## Раздзел 2 АБСЛУГОЎВАННЕ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ БІБЛІЯТЭК

### Сацыяльная роля бібліятэчнага абслугоўвання

Бібліятэка як асяродак нацыянальнай культуры і скарбніца нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей. Сацыяльныя функцыі бібліятэкі: інфармацыйная, адукацыйныя, эстэтычная, рэкрэацыйная, геданістычная, сацыялізуючая, культурна-асветніцкая і іх рэалізацыя ў абслугоўванні карыстальнікаў.

Мэта бібліятэчнага абслугоўвання як прадастаўленне карыстальніку шырокай і поўнай інфармацыі, неабходнай для вырашэння разнастайных жыццёвых праблем і спрыяючай сацыялізацыі асобы. Місія бібліятэкі як стратэгічная мэта, рэалізацыя яе ў абслугоўванні.

Задачы абслугоўвання карыстальнікаў: задавальненне разнастайных інфармацыйных патрэбнасцей; фарміраванне інфармацыйнай культуры, высокай маралі, навуковага светапогляду; выхаванне здольнасці да самастойнага мыслення.

Прынцыпы абслугоўвання як палажэнні, што вызначаюць патрабаванні да зместу, формы, арганізацыі і методыкі абслугоўвання карыстальнікаў: дыферэнцыраванага падыходу, плюралізму, дыялагічнасці, нагляднасці, камфортнасці, аператыўнасці, кангруэнтнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Сістэма і структура абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк**

Сістэма абслугоўвання карыстальнікаў як сукупнасць падраздзяленняў, форм і пунктаў абслугоўвання, якія функцыянуюць у пэўнай зоне абслугоўвання і забяспечваюць прадастаўленне карыстальнікам разнастайных бібліятэчных прадуктаў і паслуг. Сучасныя патрабаванні да сістэмы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Элементы сістэмы. Рабочае месца супрацоўніка бібліятэкі і яго абсталяванне. Арганізацыйна-функцыянальная структура абслугоўвання. Задачы функцыянальных падраздзяленняў: аддзелаў, сектараў, якія забяспечваюць абслугоўванне карыстальнікаў. Стандарты абслугоўвання. Абанемент, чытальныя залы, даведачна-інфармацыйны аддзел, пазастацыянарнае абслугоўванне. Рэкрэацыйныя зоны бібліятэкі. Бібліятэчнае асяроддзе. Узаемадзеянне функцыянальных падраздзяленняў абслугоўвання ва ўмовах інфарматызацыі.

**Рэсурсы і тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк**

Рэсурсы бібліятэчнага абслугоўвання: інфармацыйныя (бібліятэчны фонд, ДБА і інш.), інтэлектуальныя (бібліятэчны персанал), матэрыяльна-тэхнічныя (бібліятэчнае абсталяванне, памяшканне і інш.)

Тэхналогія абслугоўвання карыстальніка. Запіс чытача ў бібліятэку. Выяўленне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальніка ў форме запыту. Вызначэнне бібліятэчнага запыту. Бібліятэчны запыт і бібліятэчная паслуга. Бібліятэчная паслуга і бібліятэчны прадукт. Пошук дакументаў, неабходных для задавальнення запыту. Выдача дакументаў. Аналіз выкананай паслугі. Адказы і іх папярэджванне. Прадухіленне і ліквідацыя чытацкай запазычанасці.

Тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў у аўтаматызаваным рэжыме.

**Арганізацыя работы абанемента**

Адметныя рысы абанемента, яго значэнне як формы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі. Месца абанемента ў сістэме абслугоўвання бібліятэк розных тыпаў. Віды абанементаў: агульны, галіновы, групавы, функцыянальны. Тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў на абанеменце. Улік работы абанемента. Запіс і перарэгістрацыя карыстальнікаў. Аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў на абанеменце. МБА як асобы від абанемента.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Арганізацыя работы чытальнай залы

Чытальная зала як форма абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Адметныя рысы чытальнай залы, яе месца ў сістэме абслугоўвання карыстальнікаў. Віды чытальных залаў. Дызайн чытальнай залы. Зоны чытальнай залы: для абслугоўвання карыстальнікаў, для работы, для адпачынку. Асаблівасці фонду чытальнай залы. Тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў у чытальнай зале. Работа з перыядычнымі выданнямі. Улік работы чытальнай залы. Аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў у чытальнай зале.

## Індывідуальнае абслугоўванне карыстальнікаў

Індывідуальнае абслугоўванне як працэс сістэматычных зносін бібліятэкара з карыстальнікам. Улік індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей карыстальнікаў у індывідуальным абслугоўванні. Дапамога карыстальніку ў вызначэнні тэматыкі чытання, выбары і пошуку літаратуры для чытання, фарміраванні інфармацыйнай культуры.

Вывучэнне карыстальнікаў як аснова індывідуальнага абслугоўвання. Метады збору першаснай інфармацыі аб карыстальніках: назіранне, апытанне, аналіз чытацкіх фармуляраў і іншых дакументаў. Асноўныя катэгорыі чытачоў. Выкарыстанне дасягненняў сацыялогіі і псіхалогіі чытання ў індывідуальным абслугоўванні.

Метады індывідуальнага абслугоўвання: гутарка, інфармаванне, кансультаванне, даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне. Комплекснае выкарыстанне метадаў індывідуальнага абслугоўвання. Канфлікты ў індывідуальным абслугоўванні і шляхі выхаду з іх. Прафесійная этыка бібліятэкара.

## Наглядныя формы інфармавання і рэкамендацыі дакументаў

Значэнне наглядных форм інфармавання і рэкамендацыі дакументаў. Агульныя патрабаванні да наглядных форм інфармавання і рэкамендацыі дакументаў у бібліятэцы. Віды наглядных форм. Бібліятэчная выстава, яе прызначэнне, віды, патрабаванні да методыкі падрыхтоўкі і дэманстрацыі. Нетрадыцыйныя выставы, асаблівасці методыкі падрыхтоўкі і дэманстрацыі. Бібліятэчныя плакаты: віды, методыка распрацоўкі і афармлення. Альбомы: віды, методыка афармлення. Тэматычныя падборкі: дасье, дайджэсты, пакетаваная інфармацыя, стэнды, літаратурныя календары, бібліятэчныя газеты. Ілюстраваныя картатэкі, выконваемыя на базе Інтэрнэт-рэсурсаў і капіравальна-памнажальнай тэхнікі. Выкарыстанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучасных інфармацыйных тэхналогій у распрацоўцы, афармленні і дэманстрацыі наглядных форм інфармавання і рэкамендацыі дакументаў.

## Вусныя формы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк

Сутнасць і прызначэнне вусных форм абслугоўвання карыстальнікаў. Адметныя рысы вусных форм. Патрабаванні да методыкі іх падрыхтоўкі і правядзення. Агульныя элементы методыкі падрыхтоўкі вусных форм абслугоўвання карыстальнікаў: вызначэнне чытацкай аўдыторыі, выбар тэмы, мэты, формы, падбор дакументаў, распрацоўка праграмы, арганізацыйная работа, індывідуальная работа, выкананне паслугі, аналіз выкананай паслугі. Спалучэнне вусных і наглядных форм інфармавання і рэкамендацыі дакументаў. Выкарыстанне сродкаў музыкі, мастацкага слова, выяўленчага мастацтва, сучасных інфармацыйных тэхналогій пры падрыхтоўцы і правядзенні вусных форм абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі.

## Групавое і франтальнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк

Адметныя рысы групавога і франтальнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Формы і метады групавога і франтальнага абслугоўвання. Бібліятэчнае мерапрыемства: класіфікацыя, методыка падрыхтоўкі і правядзення.

Крытыка-аналітычныя бібліятэчныя мерапрыемствы, іх дыялогава-дыскусійны характар: дыспуты, вечарыны пытанняў і адказаў, чытацкія канферэнцыі, прэс-канферэнцыі, вечарыны-дыялогі, “круглыя сталы”, “трыбуны грамадскай думкі” і інш.

Рэкамендацыйна-інфармацыйныя бібліятэчныя мерапрыемствы як формы прапаганды актуальных тэм, выданняў, публікацый: бібліяграфічныя агляды, вусныя часопісы, прэм’еры, прэзентацыі дакументаў, інфармацыйна-пазнавальныя гадзіны.

Пазітыўна-ілюстратыўныя бібліятэчныя мерпрыемствы як формы знаёмства з пазітыўнымі фактамі і падзеямі, жыццём і дзейнасцю знакамітых людзей, адлюстраваных у творах друку: літаратурныя вечарыны, тэматычныя вечарыны-сустрэчы з цікавымі людзьмі, аўтарскія вечарыны-партрэты, літаратурна-музычныя вечарыны, бенефісы чытачоў і інш.

Групавое і франтальнае абслугоўванне карыстальнікаў як рэалізацыя рэкрэацыйнай функцыі бібліятэкі: чытацкія аб’яднанні, гурткі, салоны, гасцёўні, клубы па інтарэсах. Патрабаванні да методыкі іх стварэння і правядзення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Работа бібліятэкі з чытачамі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту

Сацыяльна-псіхалагічныя і ўзроставыя асаблівасці дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Адметныя рысы іх чытання і чытацкага развіцця. Уплыў сям'і і школы на чытанне дашкольнікаў і дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Роля бібліятэкара ў кіраўніцтве дзіцячым чытаннем.

Формы індывідуальнай работы з дашкольнікамі і малодшымі школьнікамі. Гутаркі. Віды гутарак, метадычныя асаблівасці іх падрыхтоўкі і правядзення.

Асаблівасці групавой і франтальнай работы з чытачамі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Гучныя чытанні і пераказы. Літаратурныя ранішнікі, гульні, святы кнігі, урокі дабрыні і інш.

Спецыфіка нагляднай рэкамендацыі кніг для дзяцей. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій у рабоце з чытачамі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

## Работа бібліятэкі з чытачамі-падлеткамі

Сацыяльна-псіхалагічныя і ўзроставыя асаблівасці чытачоў-падлеткаў.

Адметныя рысы іх чытання і чытацкага развіцця: пазнавальная актыўнасць, фарміраванне светапогляду, разнастайнасць чытацкіх інтарэсаў, эмацыянальнасць, аналітычнае мысленне, уласцівасці памяці, асаблівасці ўзаемаадносін з аднагодкамі і дарослымі. Выдзяленне ўзоростаўых груп падлеткаў і спецыфіка абслугоўвання кожнай з іх.

Формы індывідуальнага абслугоўвання падлеткаў. Асаблівасці індывідуальных гутарак і кансультацый. Групавое і франтальнае абслугоўванне падлеткаў. Найбольш эфектыўныя формы. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій у рабоце з чытачамі падлеткавага ўзросту.

## Работа бібліятэк па выхаванні прававой культуры карыстальнікаў

Значэнне прававой культуры ў грамадстве**.** Бібліятэчныя інфармацыйныя рэсурсы як крыніца фарміравання прававой свядомасці і прававых ведаў карыстальнікаў. Кола карыстальнікаў прававой інфармацыі.

Стварэнне пры бібліятэках цэнтраў прававой інфармацыі (ЦПІ) і іх роля ў павышэнні прававой культуры насельніцтва. Работа з базамі даных “Эталон ” і “Кансультант”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля індывідуальнага інфармавання ў фарміраванні прававой культуры карыстальнікаў. Групавыя і франтальныя формы абслугоўвання і іх роля ў фарміраванні прававой культуры.

**Работа бібліятэк па выхаванні экалагічнай культуры насельніцтва**

Роля і значэнне выхавання экалагічнай культуры насельніцтва. Бібліятэка ў сістэме экалагічнай асветы і экалагічнага выхавання. Асноўныя групы карыстальнікаў – суб'ектаў выхавання экалагічнай культуры. Формы індывідуальнай работы па выхаванні экалагічнай культуры. Формы франтальнага і масавага абслугоўвання, накіраваныя на выхаванне экалагічнай культуры. Спалучэнне наглядных і вусных форм інфармавання і рэкамендацыі дакументаў у дапамогу экалагічнай асвеце і экалагічнаму выхаванню. Чытацкія суполкі і аматарскія аб'яднанні і іх роля ў фарміраванні экалагічнай культуры насельніцтва. Узаемадзеянне бібліятэкі з грамадскімі аб'яднаннямі ў галіне экалагічнага выхавання.

**Работа бібліятэкі па выхаванні культуры чытання карыстальнікаў**

Змест паняцця "культура чытання". Элементы выхавання культуры чытання: веданне правіл карыстання бібліятэкай, асэнсаваны выбар тэматыкі чытання, уменне арыентавацца ў крыніцах інфармацыі, карыстацца ДБА, успрымаць і крытычна ацэньваць інфармацыю. Сістэматычнасць, паслядоўнасць і планамернасць як атрыбуты культуры чытання. Гігіена чытання. Валоданне прыёмамі рацыянальнага чытання.

Індывідуальныя, групавыя і франтальныя формы фарміравання культуры чытання карыстальнікаў бібліятэк. Спалучэнне наглядных і вусных метадаў у фарміраванні культуры чытання. Зваротная сувязь з карыстальнікам падчас фарміравання культуры чытання.

**Работа бібліятэк з мастацкай літаратурай і дакументамі па літаратуразнаўстве**

Роля мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ў выхаванні духоўнай, маральнай і эстэтычнай культуры карыстальнікаў. Месца мастацкай літаратуры і дакументаў па літаратуразнаўстве ў фондах публічных бібліятэк. Дыферэнцыяцыя чытачоў, якія звяртаюцца да мастацкай літаратуры. Методыка індывідуальнага абслугоўвання чытачоў мастацкай літаратурай. Групавое і франтальнае абслугоўванне аматараў мастацкай літаратуры. Чытацкія творчыя аб'яднанні пры бібліятэцы як форма мэтанакіра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванага абслугоўвання карыстальнікаў, якія звяртаюцца да мастацкай літаратуры і дакументаў па літаратуразнаўстве.

### Вывучэнне карыстальнікаў ва ўмовах бібліятэкі

Сістэматычнае вывучэнне карыстальнікаў як аснова эфектыўнага абслугоўвання ў бібліятэцы. Планаванне і арганізацыя вывучэння карыстальнікаў. Метады вывучэння карыстальнікаў: апытанне (віды апытанняў), назіранне, аналіз дакументаў. Методыка стварэння інструментарыя для правядзення даследавання (анкет, бланкаў інтэрв’ю, карт назіранняў і інш.). Падвядзенне вынікаў вывучэння і распрацоўка рэкамендацый.

### Роля бібліятэкі ў сацыялізацыі асобы карыстальніка

Сэнс тэрміна “сацыялізацыя”. Стадыі сацыялізацыі асобы: ранняе дзяцінства, дашкольны перыяд, школьны і студэнцкі ўзросты, сталасць і актыўная працоўная дзейнасць, выхад на пенсію. Асноўныя ступені сацыялізацыі: фарміраванне самасвядомасці, выбар прафесіі, стварэнне сям’і, прафесійная і асобасная самарэалізацыя. Роля інфармацыі ў працэсе сацыялізацыі на кожнай з яе стадый. Чытанне як стымулятар актыўнай творчай дзейнасці карыстальніка ў працэсе сацыялізацыі. Магчымасці бібліятэкі ўплываць на працэс сацыялізацыі асобы праз інфармацыйныя рэсурсы і паслугі. Каардынацыя дзейнасці бібліятэкі з іншымі сацыяльнымі інстытутамі, якія садзейнічаюць сацыялізацыі: сям’ёй, школай, сродкамі масавай інфармацыі, сацыяльнымі службамі і інш.

### Пазастацыянарнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк

Пазастацыянарнае абслугоўванне карыстальнікаў як форма рэалізацыі прынцыпу агульнадаступнасці бібліятэкі. Традыцыйныя формы пазастацыянарнага абслугоўвання карыстальнікаў: пункты выдачы, мабільныя бібліятэкі (бібліёбусы), кніганошаства, завочны абанемент і інш. Тэхналогія арганізацыі і работы пункта выдачы. Мабільныя бібліятэкі: гісторыя стварэння і асаблівасці функцыянавання. Кніганошаства як спосаб абслугоўвання карыстальнікаў, якія не могуць самі наведваць бібліятэку. Завочны абанемент, яго прызначэнне і ўмовы функцыянавання. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій у арганізацыі пазастацыянарнага абслугоўвання карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Міжбібліятэчны абанемент (МБА) і электронная дастаўка дакументаў (ЭДД)

МБА і ЭДД як спосаб узаемавыкарыстання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і забеспячэння аператыўнага доступу да інфармацыі. Сістэма МБА і ЭДД на Беларусі і ў СНД. Тэхналогія афармлення і атрымання заказаў па МБА. Цэнтры МБА. Змены, якія адбыліся ў тэхналогіі карыстання МБА з укараненнем аўтаматызацыі. Перспектывы бібліятэчнага абслугоўвання карыстальніка, які знаходзіцца далёка ад бібліятэкі і можа карыстацца сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі.

### Краязнаўчая дзейнасць публічных бібліятэк

Паняцце “краязнаўства”. Бібліятэчнае краязнаўства і яго задачы. ”Палажэнне аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь”(1993 г.). Рэспубліканскія і рэгіянальныя праграмы па краязнаўстве. Удзел бібліятэк у конкурсе “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” і іншых рэгіянальных мерапрыемствах.

Фонд нацыянальных дакументаў як інфармацыйны рэсурс бібліятэчнага краязнаўства. Краязнаўчыя дакументы. Мясцовыя дакументы. Крыніцы камплектавання, методыка выяўлення, збору і захавання краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Адлюстраванне краязнаўчых дакументаў у каталогах, картатэках, базах даных бібліятэкі. Абслугоўванне карыстальнікаў краязнаўчымі дакументамі. Дыферэнцыяцыя чытачоў, якія звяртаюцца да краязнаўчага фонду. Індывідуальнае абслугоўванне карыстальнікаў. Групавое і франтальнае абслугоўванне карыстальнікаў. Работа з аматарскімі аб’яднаннямі краязнаўчага накірунку. Узаемадзеянне бібліятэкі з іншымі установамі і арганізацыямі ў галіне краязнаўчай дзейнасці.

## Раздзел 3 БІБЛІЯТЭЧНЫ МАРКЕТЫНГ І БІБЛІЯТЭЧНЫ МЕНЕДЖМЕНТ

### Камунікацыйная палітыка бібліятэкі

Палітыка камунікацыі ў бібліятэцы: сутнасць, мэты. Інструменты камунікацыйнай палітыкі: рэклама, сувязі з грамадскасцю, стымуляванне збыту.

Бібліятэчная рэклама: задачы, функцыі. Патрабаванні да формы і тэксту рэкламы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мерапрыемствы па сувязях з грамадскасцю (“паблік рылейшнз”): задачы, напрамкі. Уплыў паблік рылейшнз і рэкламнай дзейнасці на імідж бібліятэкі.

Фірменны стыль бібліятэкі як важнейшы элемент яе іміджу.

Стымуляванне збыту: мэты, задачы. Сродкі стымулявання збыту бібліятэчна-інфармацыйных паслуг.

## Рэклама бібліятэкі

Рэклама як сродак інфармацыі аб прадукцыі/паслугах бібліятэкі.

Прызначэнне рэкламы. Мэты рэкламы. Віды рэкламы: інфармацыйная, пераканальная, параўнальная, напамінальная.

Формы рэкламы: паштовая, у СМІ, відэарэклама, друкаваная рэклама (лістоўкі, буклеты, праспекты, каталогі, плакаты).

Знешняя рэклама: рэкламныя шчыты, вывескі, вітрыны. Бібліятэчныя выставы і ярмаркі як частка комплексу маркетынга і як сродак распаўсюджання бібліятэчнай рэкламы.

Асаблівасці ўнутрыбібліятэчнай рэкламы. Характарыстыка форм, відаў. Прэстыжная рэклама: асноўныя кампаненты. Фірменны стыль бібліятэкі.

Камп’ютэрная рэклама, размяшчэнне інфармацыі на Web-серверы бібліятэкі, перасылка электронных пісем, удзел у арганізацыі і правядзенні тэлеканферэнцый.

## Кіраванне бібліятэчнай справай

Прававая аснова кіравання бібліятэчнай справай. Характарыстыка законаў Рэспублікі Беларусь (Закон “Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь (рэдакцыя 2002 г.)”, Закон “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь”) як асноўных кіраўнічых дакумента.

Дзяржаўна-грамадскае кіраванне бібліятэчнай справай. Роля і функцыі дзяржаўных і мясцовых заканадаўчых органаў у кіраванні бібліятэчнай справай. Міністэрсіва культуры Рэспублікі Беларусь (МК РБ) як цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання. Функцыі МК РБ.

Выканаўчыя дзяржаўныя і мясцовыя органы кіравання бібліятэчнай справай, іх функцыі. Упраўленні культуры аблвыканкамаў, гарадскія ўпраўленні культуры, раённыя аддзелы культуры пры выканкамах. Кіраванне сеткамі і сістэмамі бібліятэк ведамстваў і грамадскіх арганізацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадскае кіраванне бібліятэчнай справай. Бібліятэчныя грамадствы і асацыяцыі, іх роля і функцыі ў кіраванні бібліятэчнай справай.

Беларуская бібліятэчная асацыяцыя (ББА).

**Бібліятэчная статыстыка**

Задачы бібліятэчнай статыстыкі, яе роля ў кіраванні бібліятэчнай справай. Раздзелы бібліятэчнай статыстыкі: статыстыка бібліятэчнага фонду, статыстыка бібліятэчнага абслугоўвання, статыстыка бібліятэчнай сеткі, статыстыка бібліятэчных кадраў.

Арганізацыя статыстычнай работы ў бібліятэцы. Справаздача бібліятэкі. Віды справаздач. Статыстычная справаздача бібліятэкі за год: форма №6 – НК (2007), патрабаванні, змест і методыка запаўнення. Паказчыкі бібліятэчнай статыстыкі: абсалютныя, адносныя, сярэднія.

Тлумачальная запіска (тэкставая справаздача), яе змест. Справаздача бібліятэкі перад грамадскасцю (органамі мясцовай улады, насельніцтвам).

Справаздача ЦСДПБ як адзінай сістэмы.

**Улік работы бібліятэкі**

Улік як працэс сістэматычнага рэгістравання ўсіх працэсаў работы бібліятэкі.

Значэнне ўліку і справаздачы для арганізацыі і кантролю за дзейнасцю бібліятэкі, захаваннем бібліятэчных фондаў; выяўленне лепшага вопыту, інавацыйнай дзейнасці бібліятэкі, аналіз стану бібліятэчнай справы ў рэгіёне і Рэспубліцы.

Віды ўліку: аператыўны, статыстычны, бухгалтарскі, іх узаемасувязь. Аб’екты і формы ўліку. СТБ 7.20-2000 “Бібліятэчная статыстыка”.

**Планаванне работы бібліятэкі**

План работы бібліятэкі: вызначэнне паняцця, значэнне, патрабаванні да складання. Віды планаў бібліятэкі: гадавы, квартальны, каляндарны.

Гадавы план работы бібліятэкі. Асноўныя раздзелы і іх змест. Разлік кантрольных паказчыкаў плана.

Квартальны план, асноўныя раздзелы і іх змест. Планаванне асноўных паказчыкаў па кварталах.

Каляндарны план, яго структура, змест.

Планаванне асобных відаў работ, індывідуальнае планаванне работы.

Планаванне работы ЦСДПБ як адзінай сістэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Метадычнае забеспячэнне бібліятэчнай дзейнасці

Метадычнае забеспячэнне бібліятэчнай дзейнасці, яго сутнасць, задачы, прынцыпы.

Дзяржаўная сістэма метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі – каардынацыйны цэнтр метадычнага забеспячэння.

Роля абласных бібліятэк у арганізацыі метадычнага забеспячэння бібліятэк вобласці, іх задачы і функцыі.

Цэнтральныя бібліятэкі ЦСДПБ як цэнтры метадычнага забеспячэння, іх задачы і функцыі.

Сістэма метадычнага забеспячэння спецыяльных бібліятэк.

Асноўныя кірункі метадычнага забеспячэння: кансультацыйна-метадычная дапамога бібліятэкам, інавацыйная дзейнасць, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Кансультацыйна-метадычная дапамога бібліятэкам: кансультацыі, выезды ў бібліятэкі, метадычныя дапаможнікі, пісьмы, распрацоўкі, інструктыўна-метадычныя матэрыялы.

Інавацыйная дзейнасць бібліятэк. Прапаганда навацый і іх распаўсюджвання ў бібліятэках. Прымяненне бібліятэчнага маніторынгу ў дзейнасці навукова-метадычных службаў.

Павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў: семінары, практыкумы, курсы, школы прафесійнага майстэрства, дыскусійныя бібліятэчныя клубы і інш.

### Фандрэйзінгавая дзейнасць бібліятэкі

Вызначэнне тэрміну “бібліятэчны фандрэйзінг”. Фандрэйзінг як накірунак “паблік рылейшнз”. Планаванне фандрэйзінгавай дзейнасці.

Крыніцы дадатковага пазабюджэтнага рэсурснага забеспячэння бібліятэкі: агульная характарыстыка.

Гранты як адрасныя асігнаванні на канкрэтныя накірункі дзейнасці бібліятэкі.

Бібліятэкі і дабрачыннасць: сацыяльныя асновы ўзаемадзеяння.

## Раздзел 4 АРГАНІЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭЧНЫХ ФОНДАЎ І КАТАЛОГАЎ. КАМПЛЕКТАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ

Сутнасць і значэнне камплектавання. Камплектаванне бібліятэчнага фонду як двухбаковы працэс. Віды камплектавання: бягучае і рэтраспек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўнае. Этапы камплектавання. Тэхналогія камплектавання. Першасны адбор дакументаў са знешніх інфармацыйных патокаў. Другасны адбор дакументаў. Крытэрыі другаснага адбору. Выключэнне з фонду непатрэбных дакументаў. Даведачны аппарат у дапамогу камплектаванню.

### Крыніцы камплектавання бібліятэчнага фонду

Крыніцы і спосабы камплектавання бібліятэчнага фонду ва ўмовах рыначных адносін і інфарматызацыі грамадства. Узаемадзеянне кнігавыдавецкіх, кнігагандлёвых арганізацый і бібліятэк у працэсе камплектавання.

Крыніцы камплектавання: сістэма абавязковага экземпляра, бібліятэчны калектар, кніжны гандаль, выдавецтвы, падпіска, інтэрнэт–магазіны. Міжнародны і міжбібліятэчны кнігаабмен як спосаб папаўнення фонду бібліятэкі. Крыніцы безвыплатнага фонду бібліятэкі: узамен страчаных, дар бібліятэцы, рэпрадуцыраванне і капіраванне. Аўтаматызацыя працэсаў заказу дакументаў і кантроль за іх паступленнем.

### Спосабы расстаноўкі бібліятэчнага фонду

Расстаноўка бібліятэчных фондаў і яе значэнне. Патрабаванні да расстаноўкі.

Расстаноўкі змястоўнага тыпу: сістэматычная, тэматычная, прадметная.

Расстаноўкі фармальнага тыпу: алфавітная, храналагічная, геаграфічная, моўная, фарматная, нумарацыйная.

Сістэматычна-алфавітная расстаноўка – галоўны спосаб расстаноўкі дакументаў у публічных бібліятэках. Правілы расстаноўкі дакументаў пры сістэматычна-алфавітнай расстаноўцы. Прымяненне іншых спосабаў расстановак у публічных бібліятэках.

### Праверка бібліятэчнага фонду

Значэнне, задачы і тэрміны праверкі бібліятэчнага фонду. Падрыхтоўка да праверкі. Стварэнне камісіі па праверцы фонду і яе задачы. Абвяшчэнне карыстальнікаў аб праверцы бібліятэчнага фонду.

Спосабы праверкі бібліятэчнага фонду. Састаўленне акта праверкі і яго абмеркаванне на пасяджэнні Савета бібліятэкі. Вывады і прапановы камісіі па ліквідацыі выяўленых недахопаў. Зацвярджэнне акту праверкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Матэрыяльная адказнасць работнікаў бібліятэк за захаванасць бібліятэчнага фонду.

Абавязковая праверка бібліятэчнага фонду пры замене загадчыка філіяла (аддзела). Арганізацыя работы бібліятэкі ў час здачы-прыёму аддзела або бібліятэкі. Праверка бібліятэчнага фонду пры наяўнасці аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў.

### Значэнне, віды і формы ўліку бібліятэчнага фонду

Значэнне ўліку бібліятэчнага фонду і патрабавані да яго. Адзінкі ўліку, віды і формы. Прымяненне "Інструкцыі па ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў у Рэспубліцы Беларусь". Аднолькавасць прыёмаў і форм уліку. Адзінкі бібліятэчнага фонду: сумарны і індывідуальны. Формы ўліку: "Кніга сумарнага ўліку, "Інвентарная кніга", уліковы каталог, рэгістрацыйная картатэка ўліку газет і часопісаў. Іх характарыстыка.

### Сумарны ўлік бібліятэчнага фонду

Сумарны ўлік дакументаў: электронны і традыцыйны, яго значэнне. Электронная кніга сумарнага ўліку (ведамасць сумарнага ўліку). Яе характарыстыка. Сумарны ўлік у традыцыйнай форме. Кніга сумарнага ўліку ЦСДПБ і бібліятэк-філіялаў. Тры часткі кнігі сумарнага ўліку. Правілы запаўнення асобных граф усіх частак кнігі сумарнага ўліку бібліятэчнага фонду на ўсю ЦСДПБ, а таксама на фонды ЦБ і бібліятэк–філіялаў. Сумарны ўлік газет і часопісаў. Сумарны ўлік іншых відаў дакументаў (мікраформ, АВ–дакументаў, выяўленчых і электронных дакументаў. Дакладнасць вядзення ўліковых дакументаў.

### Індывідуальны ўлік бібліятэчнага фонду

Значэнне індывідуальнага ўліку бібліятэчнага фонду і патрабаванні да яго. Формы індывідуальнага ўліку: уліковы каталог, інвентарная кніга, зводная рэгістрацыйная картатэка перыядычных выданняў.

Уліковы каталог і правілы яго вядзення. Афармленне картак уліковага каталога і характарыстыка звестак, якія ўказваюцца на вонкавым і адваротным баку картак. Уліковы каталог ў аўтаматызаваным рэжыме. Адказнасць за вядзенне і захоўванне ўліковага каталога.

Значэнне і правілы вядзення інвентарнай кнігі ў традыцыйнай і электроннай форме. Запаўненне граф інвентарнай кнігі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зводная рэгістрацыйная картатэка перыядычных выданняў і правілы яе вядзення. Афармленне і расстаноўка картак.

Індывідуальны ўлік іншых відаў дакументаў (мікраформ, АВ–дакументаў, выяўленчых і электронных дакументаў).

## Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя

Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя (ББК), яе прынцыповыя асновы. Структура ББК (асноўныя дзяленні, дапаможныя дзяленні, алфавітна-прадметны паказальнік (АПП), іх характарыстыка). Індэксацыя. Развіццё ББК і яе выкарыстанне ў бібліятэках Беларусі. Удасканаленне ББК, яе дапаўненні і перавыданні. Выкарыстанне ББК ва ўмовах аўтаматызацыі.

## Агульная методыка сістэматызацыі дакументаў

Паняцце "сістэматызацыя" і яе задачы. Аб'ект сістэматызацыі.

Агульная і прыватная методыкі сістэматызацыі. Метады сістэматызацыі: адносіны агульнага да прыватнага, шматразовае адлюстраванне, па прымяненні ці мэтавым прызначэнні, па аб'екту, аналітычнай сістэматызацыі. Сістэматызацыя дакументаў па гісторыі навукі, біяграфій знакамітых вучоных.

Тэхналагічныя працэсы і правілы сістэматызацыі. Выбар табліц класіфікацыі ў залежнасці ад тыпу бібліятэкі, віду дакументаў, якія належаць сістэматызацыі. Удакладненне і стварэнне рабочых табліц класіфікацыі. Метадычны і даведачны апарат сістэматызатара.

Працэсы сістэматызацыі, іх сутнасць і паслядоўнасць. Віды класіфікацыйных індэксаў у залежнасці ад функцый, якія яны выконваюць (поўны, каталожны, палічны, асноўны, дадатковы, просты, састаўны).

Афармленне картак традыцыйнага алфавітнага і сістэматычнага каталогаў.

## Сістэматызацыя прыродазнаўчай літаратуры

Аддзел "2 Прыродазнаўчыя навукі", яго структура і напаўненне. Асаблівасці сістэматызацыі дакументаў аб глабальных экалагічных катастрофах, па экалагічнай тэматыцы, анамальных прыродных з'явах. Размежаванне літаратуры па прыродазнаўчых навуках з аддзеламі прыкладных навук. Выкарыстанне правіл агульнай методыкі пры сістэматызацыі прыродазнаўчай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкарыстанне дапаможных табліц (агульных і тэрытарыяльных). Асаблівасці сістэматызацыі дакументаў з пададдзела "26.8 Геаграфічныя навукі".

## Сістэматызацыя літаратуры па прыкладных навуках

Значэнне і выкарыстанне тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры ў публічных бібліятэках. Структура і напаўненне аддзела "3 Тэхніка. Тэхнічныя навукі". Размежаванні пры сістэматызацыі літаратуры па пытаннях тэхнікі з дзяленнямі аддзелаў прыродазнаўчых навук, сельскай і лясной гаспадаркі, эканомікі. Выкарыстанне агульных тэрытарыяльных і спецыяльных тыпавых дзяленняў (СТД № 1 і 2). Афармленне картак на аснове правіл агульнай методыкі.

Структура і напаўненне аддзела "4 Сельская і лясная гаспадарка. Сельскагаспадарчыя і лесагаспадарчыя навукі". Прымяненне правіл агульнай методыкі сістэматызацыі дакументаў. Сувязі і размежаванні з аддзелам прыродазнаўчых навук, тэхнікі, эканомікі. Выкарыстанне агульных, тэрытарыяльных і спецыяльных тыпавых дзяленняў у адпаведных пададдзелах.

Асаблівасці сістэматызацыі дакументаў па гісторыі сельскай і лясной гаспадаркі, передавым вопыце. Выкарыстанне метаду паўторнага адлюстравання.

## Сістэматызацыя грамадска–палітычнай літаратуры

Аддзел "6/8 Грамадскія і гуманітарныя навукі", яго структура і напаўненне.

Агульная характарыстыка, структура, змест і напаўненне падраздзелаў 60/67 грамадска-палітычнай літаратуры. Размежаванні паміж аддзеламі. Выкарыстанне табліц агульных, тэрытарыяльных і спецыяльных тыпавых дзяленняў.

Пададдзел "60 Грамадскія навукі ў цэлым". Методыка сістэматызацыі дакументаў па пытаннях сацыялогіі, статыстыкі, дэмаграфіі. Асаблівасці сістэматызацыі дакументаў па галіновай сацыялогіі і статыстыцы.

## Сістэматызацыя літаратуры па гісторыі і гістарычных навуках

Пададдзел "63.3 Гісторыя. Гістарычныя навукі", яго месца ў аддзеле грамадска–палітычных навук, структура, напаўненне. Значэнне храналагічных і тэрытарыяльных прымет пры выбары класіфікацыйнага рашэн-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня. Размежаванні пры сістэматызацыі выданняў па гісторыі з літаратурай пададдзелаў "65 Эканоміка. Эканамічныя навукі.", "66 Палітыка. Палітычныя навукі.", "67 Права. Юрыдычныя навукі", "68 Ваенная справа. Ваенная навука". Выкарыстанне ў пададдзеле "63.3 Гісторыя. Гістарычныя навукі" метаду паўторнага адлюстравання і табліц агульных, тэрытарыяльных і спецыяльных тыпавых дзяленняў.

Асаблівасці сістэматызацыі літаратуры па гісторыі Беларусі. Выкарыстанне матэрыялаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па методыцы сістэматызацыі выданняў гістарычнай тэматыкі аб Рэспубліцы Беларусь.

Сістэматызацыя дакументаў з пададдзелаў "63.4 Археалогія" і "63.5 Этнаграфія".

## Сістэматызацыя літаратуры па эканоміцы і эканамічных навуках

Структура і змест пададдзела "65 Эканоміка. Эканамічныя навукі". Размежаванні пры сістэматызацыі літаратуры па эканоміцы з пададдзелам "63.3 Гісторыя. Гістарычныя навукі". Методыка сістэматызацыі літаратуры па эканоміцы і эканамічных навуках, агульнай эканамічнай тэорыі, гісторыі эканамічнай думкі, эканамічнай геаграфіі, пытаннях кіравання экономікай, эканамічнай статыстыцы, уліку, эканамічнаму аналізу. Асаблівасці сістэматызацыі літаратуры па спецыяльных і галіновых эканоміках, эканоміцы прадпрыемстваў, сусветнай эканоміцы. Сістэматызацыя літаратуры па эканоміцы Беларусі і эканоміцы асобных замежных краін.

Выкарыстанне ў пададдзеле "65 Эканоміка. Эканамічныя навукі" матэрыялаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па методыцы сістэматызацыі выданняў па эканоміцы Беларусі і табліц агульных, тэрытарыяльных і спецыяльных тыпавых выданняў.

## Сістэматызацыя літаратуры па палітыцы і палітычных навуках

Структура і змест пададдзела "66 Палітыка. Палітычныя навукі". Размежаванні пры сістэматызацыі літаратуры паміж дзяленнямі пададдзела "66 Палітыка. Палітычныя навукі" з пададдзеламі "63.3 Гісторыя. Гістарычныя навукі", "65 Эканоміка. Эканамічныя навукі".

Методыка сістэматызацыі літаратуры па тэорыі і паліталогіі, гісторыі палітычнай думкі, аб сучасным палітычным стане ў цэлым, унутранай, знешняй і нацыянальнай палітыцы дзяржаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці сістэматызацыі літаратуры па пытаннях палітыкі Рэспублікі Беларусь і палітыкі асобных замежных краін. Сістэматызацыя літаратуры аб палітычных партыях, грамадска-палітычных арганізацыях, рухах, саюзах.

Выкарыстанне ў пададдзеле "66 Палітыка. Палітычныя навукі" матэрыялаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па методыцы сістэматызацыі палітычнай літаратуры і дапаможных табліц тыпавых дзяленняў.

**Сістэматызацыя літаратуры аб праве і юрыдычных навуках**

Структура і змест пададдзела "67 Права. Юрыдычныя навукі". Методыка сістэматызацыі літаратуры па тэорыі і гісторыі права, галінах права (канстытуцыйным (дзяржаўным), адміністратыўным, фінансавым, грамадзянскім, тарговым і сямейным праве, працоўным праве і сацыяльным забеспячэнні, кааператыўным, зямельным і інш. галінах права, крымінальным і грамадзянска-працэсуальным праве, міжнародным праве); галінах ведаў, якія прымыкаюць да юрыспрудэнцыі (крыміналогіі і крыміналістыкі), органах юстыцыі.

Выкарыстанне ў пададдзеле "67 Права. Юрыдычныя навукі" матэрыялаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па методыцы сістэматызацыі выданняў аб праве і юрыдычных навуках, табліц агульных і тэрытарыяльных тыпавых дзяленняў.

**Сістэматызацыя выданняў па філалагічных навуках**

Аддзел " 80/84 Філалагічныя навукі. Мастацкая літаратура", яго структура і напаўненне. Выкарыстанне ў аддзеле агульных, тэрытарыяльных і спецыяльных тыпавых дзяленняў.

Структура пададдзела " 81 Мовазнаўства". Прымяненне СТД. Асаблівасці сістэматызацыі слоўнікаў і адаптаваных выданняў.

Змест і структура пададдзела "82 Фальклор. Фалькларыстыка". Размежаванне пры сістэматызацыі выданняў фальклору, літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры.

Структура і змест пададдзела "83 Літаратуразнаўства", "84 Мастацкая літаратура". Улік тэрытарыяльных і моўных прымет, а таксама літаратурнага жанру пры выбары класіфікацыйнага рашэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Сістэматызацыя літаратуры універсальнага зместу

Структура і змест аддзела "9 Літаратура універсальнага зместу". Асаблівасці сістэматызацыі бібліяграфічных дапаможнікаў універсальнага зместу і галіновых. Выкарыстанне пры сістэматызацыі бібліяграфічных дапаможнікаў метаду паўторнага адлюстравання. Сістэматызацыя даведачных выданняў універсальнага зместу і галіновых. Сістэматызацыя серый, зборнікаў цытат і афарызмаў.

## Алфавітны каталог, яго арганізацыя, вядзенне, выкарыстанне

Задачы, функцыі і структура алфавітнага каталога (АК). Месца і роля АК у даведачна-бібліяграфічным апараце бібліятэкі.

Арганізацыя АК. Правілы расстаноўкі асноўных і дадатковых бібліяграфічных запісаў, даведачных і спасылачных картак. Фарміраванне аўтарскіх комплексаў. Лагічная расстаноўка апісання твораў індывідуальных і калектыўных аўтараў, апісанняў пад назвай.

Афармленне АК: знешняе і ўнутранае. Раздзяляльнікі, іх назначэнне і віды: літарныя, складовыя і славесныя.

Рэдагаванне АК. Віды рэдагавання. Рэклама каталога.

## Сістэматычны каталог, яго арганізацыя, вядзенне, выкарыстанне

Задачы, функцыі і структура сістэматычнага каталога (СК). Навуковая аб'ектыўнасць у адборы матэрыялу, многааспектнасць адлюстравання фонду, даступнасць.

Асноўныя працэсы арганізацыі сістэматычнага каталога. Фарміраванне аддзелаў і раздзелаў каталога.

Знешняе і ўнутранае афармленне каталога. Афармленне каталожных раздзяляльнікаў. Залежнасць формы раздзяляльніка ад ступені дробнасці дзялення. Надпісы на раздзяляльніках.

Групоўка бібліяграфічных запісаў унутры класіфікацыйных дзяленняў. Алфавітны парадак расстаноўкі, выдзяленне біяграфічных дакументаў.

Складанне пашпарта каталога.

Алфавітна-прадметны паказальнік (АПП) – дапаможны апарат да сістэматычнага каталога. Яго функцыі, методыка састаўлення. Фармуліроўка рубрык АПП, віды рубрык, афармленне.

Рэдагаванне сістэматычнага каталога і АПП. Рэклама каталога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс літаратуры

*1. Аб інфарматызацыі:* закон Рэсп. Беларусь: прыняты 6 вер. 1995 г. // Ведамасці Вярхоўн. Савета Рэсп. Беларусь. – 1995. – № 33. – Арт.428. – С. 3–16.

*2. Аб унясенні* змяненняў і дапаўненняў у закон Рэспублікі Беларусь "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь": закон Рэсп. Беларусь ад 11 лістапада 2002 г. № 147-3 // Нац.реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. – № 128. – С.21–29.

*3. Аб электронным* дакуменце: закон Рэсп. Беларусь: прыняты 14 мая 1999 г. // Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэсп.Беларусь. – 2000. – № 3. – Арт. 27. – С. 26–37.

*4. Библиотечная* энциклопедия. – М.: Пашков дом, 2007. – С. 139–143; 171; 181; 2128.

*5. Библиотечно-библиографическая* классификация: рабоч.табл. для мас. б-к. – М., 1997. – 688 с.

*6. Библиотечно-библиографическая* классификация: сред. табл. – М.: Либерея, 2001. – Вып. 1-3.

*7. Библиотечно-библиографическая* классификация: табл. для дет. и шк. б-к. – 3-е изд., испр. и доп. – М., 1998 – 320 с.

*8. Библиотечное* обслуживание: теория и методика: учебник / под ред. А.Я.Айзенрберга. – М., 1996. – 98 с.

*9. Ванеев, А.Н.* Библиотековедение в России конца XX века: учеб. пособие / А.Н. Ванеев. – СПб.: Профессия, 2007. – С. 64–68; 123–126; 160–181.

*10. Воронько, К.Л.* Библиотечные фонды: учеб. для библ. техникумов и библ. отделений культ.-просвет. училищ. / К.Л. Воронько. – М.: Кн. палата, 1992. – 240 с.

*11. ГОСТ 7.1 – 2003.* Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления =Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення.– Взамен ГОСТ 7.1–84, ГОСТ 7.16–79, ГОСТ 7.18–79, ГОСТ 7.34–81, ГОСТ 7.40–82; введ. 2004-11-01. – Мінск, 2004. – 48 с.

*12. ГОСТ 7.59-2003.* Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации.–Взамен ГОСТ 7.59–90; введ. 2004–01–01.–М., 2003.–5 с.

*13. ГОСТ 7.80–2000.* Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления.–Введ. 2001–11–01. – Мінск, 2001.–8 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. ГОСТ 7.82–2001.* Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления.= Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне электронных рэсурсаў. Агульныя патрабаванні і правілы складання.-Введ.2003–01–01.– Мінск, 2002. – 23 с.

*15. Демидова, С.Е.* Краеведческий документ: библиотечная обработка: учебно-практ. пособие / С.Е. Демидова. - М.: Либерея-Бибинформ, 2006. -104 с. – (Серия "Библиотекарь и время. XXI век»).

*16. Дзямешка, Л.А.* Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк: вучэб. дапаможнік / Л.А.Дзямешка, С.А.Паўлава. – Мінск: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – 111 с.

*17. Езова, С.А.* Культура общения библиотекарей: учеб.-метод. пособие. – М., 2004. – 144 с.

*18. Зборнік* нарматыўна-рэгламентуючых дакументаў па бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь / НББ; склад. І.А. Прылішч. – Мінск, 1996. – 214 с.

*19. Інструкцыя* па ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў у Рэспубліцы Беларусь / Нац. б-ка Беларусі [і інш.]. – Мінск, 2002. – 37 с.

*20. Карташов, Н.С.* Общее библиотековедение: учебник: в 2 ч. Ч.1–2 / Н.С.Карташов, В.В.Скворцов. – М.: Мос.гос.ун-т культуры, 1996–1997.

*21. Качанова, Е.Ю.* Инновации в библиотеках / Е.Ю.Качанова; науч. ред. В.А. Минкина. – СПб.: Профессия, 2003. – С. 129 – 173.

*22. Краеведческая* составляющая библиотечно-библиографического обслуживания // Справочник библиотекаря. – СПб.: Профессия, 2003. – С. 171–176.

*23. Краязнаўчая* дзейнасць бібліятэк: метад. рэкамендацыі / Нац.б-ка Беларусі; [склад. Р.М.Чыгірова, М.У.Сакалова]. – Мінск, 1994. – С. 42–67.

*24. Криворотенко, С.Н.* Краеведческий фонд библиотек: учеб. пособие / С.Н. Криворотенко. – Москва: Либерея-Бибинформ, 2006. – С. 5–16. – («Библиотекарь и время. XXI век»).

*25. Кушнаренко, Н.Н.* Краеведческая деятельность библиотеки: учеб. пособие / Н.Н. Кушнаренко. – М.: МГИК, 1993. – С. 58–79.

*26. Ляйко, Н.А.* Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэб. дапаможнік / Н.А.Ляйко, А.І.Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – 180 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*27. Мотульский, Р.С.* Общее библиотековедение: учеб. пособие для вузов / Р.С.Мотульский. – М.: Либерея, 2004. – 224 с.

*28. Пераверзева, Ю.А.* Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэбна-метад. дапаможнік / Ю.А. Пераверзева. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – С. 6 – 85.

*29. Справочник* библиотекаря / под ред. А.Н.Ванеева, В.А.Минкиной. –СПб.: Профессия, 2000. – С. 139–176, 281-290.

*30. СТБ 7.20 – 2000.* Бібліятэчная статыстыка: асноўныя палажэнні. – Мінск, 2000. – 11 с.

*31. Столяров, Ю.Н.* Библиотечный фонд: учебник / Ю.Н.Столяров. – М.: Книж.палата, 1991. – 272 с.

*32. Сукиасян, Э.Р.* Библиотечные каталоги: метод. материалы / Сукиасян Э.Р. – М.: [Профиздат], 2001. – 187 с.

*33. Сукиасян, Э.Р.* Школа индексирования: практ.пособие/Э.Р. Сукиасян.–М.: Либерия–Бибинформ, 2005.–Вып.39.–144 с.

*34. Суслова, И.М.* Основы библиотечного менеджмента: [учеб.-практ. пособие] / И.М. Суслова. – М.: Либерия, 2000. – 232 с.

*35. Суслова, И.М.* Практический маркетинг в библиотеках: учеб.-метод. пособие / Суслова И.М. – М., 2004. – 144с.

*36. Терёшин, В.И.* Библиотечный фонд: учеб. пособие / В.И. Терёшин. – 2-е изд.,испр. и доп. – М.: Изд-во МГУКИ, 2000. – 176 с.

*37. Яцэвіч, М.А.* Карпаратыўныя бібліятэчныя сістэмы і іх роля ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў Беларусі / М.А. Яцэвіч // Информационное обеспечение науки Беларуси: прошлое, настоящее, будущее.− Мінск: Нац. акад. навук Беларусі, 2003.− С.42-50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯГРАФІЯ

## Праграма для паступаючых на скарочаны тэрмін навучання на ФІДК у межах функцыянавання сістэмы бесперапыннай падрыхтоўкі «тэхнікум - ВНУ»

Праграма ўступных іспытаў падрыхтавана ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам «Сярэдняя спецыяльная адукацыя. Спецыяльнасць 2-23 01 31 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» і праграмай па «Бібліяграфазнаўстве» для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці 2-23 01 31 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», распрацаванай выкладчыкамі УА «Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А.С.Пушкіна».

У праграме выдзяляюцца тры раздзелы. У першым – «Бібліяграфазнаўства: тэарэтычныя і арганізацыйныя пытанні» – сканцэнтравана ўвага на пытаннях, якія звязаны з сучаснымі ўяўленнямі аб паняццях бібліяграфіі, бібліяграфазнаўстве, бібліяграфічнай інфармацыі (асноўных формах яе замацавання і перадачы), бібліяграфічнай дзейнасці, арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. У другім раздзеле «Інфармацыйныя рэсурсы» разглядаюцца пытанні першасных дакументных рэсурсаў як аб’ектаў бібліяграфавання, а таксама бібліяграфічныя рэсурсы як сродкі і вынікі бібліяграфічнай дзейнасці. У трэцім раздзеле «Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнай работы бібліятэк» увага сканцэнтравана на асноўных напрамках бібліяграфічнай работы бібліятэк (пераважна публічных) у новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах: пытаннях арганізацыі даведачна-бібліяграфічнага апарата бібліятэкі, складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк, бібліяграфічнага абслугоўвання, фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў.

Акрамя арыентацыі на змест праграмы, ў час адказу на пытанні білета, абітурыент можа таксама выкарыстоўваць веды і ўменні, атрыманыя ў час практычнай работы ў бібліятэцы.

Іспыты праводзяцца ў вуснай форме. У білетах да іспытаў прапануюцца два пытанні: адно пытанне з раздзелаў агульнага бібліяграфазнаўства, другое – з раздзелу спецыяльнага бібліяграфазнаўства. Пры выстаўленні адзнакі за адказ выкарыстоўваюцца патрабаванні, выкладзеныя ў метадычных указаннях «Крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў на ўступных экзаменах».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 1 БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ

### Агульнае ўяўленне аб бібліяграфіі і бібліяграфазнаўстве

Узнікненне і трансфармацыя паняцця "бібліяграфія". Сучасныя ўяўленні аб бібліяграфіі, бібліяграфічнай дзейнасці. Паняцце "бібліяграфічная інфармацыя"; адрозненне бібліяграфічнай інфармацыі ад іншых відаў сацыяльнай інфармацыі. Формы замацавання і перадачы бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічнае паведамленне, бібліяграфічны запіс, бібліяграфічны дапаможнік).

Бібліяграфазнаўства як сукупнасць навуковых ведаў аб бібліяграфіі. Характарыстыка асноўных раздзелаў бібліяграфазнаўства: тэорыі, гісторыі, арганізацыі, тэхналогіі (методыкі).

Грамадскае значэнне бібліяграфіі.

### Бібліяграфічная прадукцыя: тыпы і жанры

Бібліяграфічная прадукцыя як вынік працэсу бібліяграфавання. Характарыстыка асноўных тыпаў бібліяграфічных дапаможнікаў: паказальніка, спіса, агляда. Асаблівасці іх структуры, складу даведачна-метадычнага апарата.

Метадычныя асаблівасці жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў: бібліяграфічных манаграфій, гутарак аб кнігах, "колаў чытання", папулярных бібліяграфічных даведнікаў, планаў чытання і інш.

### Відавая класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў

Відавая класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў па грамадскім (мэтавым і чытацкім) прызначэнні. Віды бібліяграфічных дапаможнікаў па грамадскім прызначэнні. Галоўнае мэтавае і чытацкае прызначэнне дзяржаўных бібліяграфічных паказальнікаў, навукова-дапаможных, рэкамендацыйных, прафесійна-вытворчых, выдавецкіх і кнігагандлёвых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Відавая класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў па змесце аб'ектаў бібліяграфавання. Асаблівасці універсальных, галіновых, тэматычных, персанальных біябібліяграфічных, краіназнаўчых і краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Прыклады дапаможнікаў рознага зместу, выдадзеныя цэнтрамі бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь**

Арганізацыйна-ведамасная раздробленасць як асаблівая рыса арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь: Нацыянальная кніжная палата, бібліятэкі, выдавецтвы, кніжныя магазіны, органы НТІ, архівы, музеі, СМІ, асаблівасці выканання імі бібліяграфічных накірункаў дзейнасці.

Нацыянальная кніжная палата Беларусі як нацыянальны бібліяграфічны цэнтр, яе задачы, функцыі, накірункі дзейнасці, сістэма бібліяграфічных выданняў.

Бібліятэкі ў сістэме бібліяграфічнай дзейнасці краіны, асаблівасці іх функцыянавання як бібліяграфічных цэнтраў, дыферэнцыяцыя іх функцый у залежнасці ад ведамаснай, змястоўнай і тэрытарыяльнай прыналежнасці. Месца, роля і функцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў адлюстраванні бібліяграфічнымі сродкамі фонду сваёй бібліятэкі і бібліятэк краіны, стварэнні крыніц агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі, бібліяграфічным абслугоўванні карыстальнікаў бібліятэкі, фарміраванні іх бібліяграфічнай культуры, навукова-даследчай і навукова-метадычнай рабоце. Абласныя універсальныя навуковыя бібліятэкі як цэнтры краязнаўчай бібліяграфіі, інфармацыйныя цэнтры па культуры і мастацтве, навукова-метадычныя цэнтры ў рэгіёне, асноўныя напрамкі іх бібліяграфічнай дзейнасці. Асаблівасці арганізацыі і змест бібліяграфічнай дзейнасці публічных бібліятэк краіны.

Узаемадзеянне бібліяграфічных цэнтраў – аб’ектыўная неабходнасць на шляху фарміравання адзінай інфармацыйнай сістэмы краіны. Асаблівасці ўзаемадзеяння бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў.

## Раздзел 2 ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ

### Знакавая форма дакументаў

Грамадскія патрэбнасці ў дакуменце. Кадзіроўка інфармацыі на матэрыяльным носьбіце. Характэрныя рысы інфармацыйных кодаў. Мова як сістэма сімвалаў для замацавання інфармацыі ў дакуменце. Віды моў: натуральныя, штучныя, іх адрозненне і асаблівасці. Гукавая мова, яе магчымасці і недахопы ў замацаванні і перадачы інфармацыі. Знакавы характар інфармацыі ў дакуменце. Віды знакаў: моўныя, нямоўныя, знакі-выявы, эмблемныя, трохмерныя, знакі-сімвалы.

Асаблівасці і віды тэкставых, ідэаграфічных, іканічных, аўдыёвізуальных, машыначытальных, сімвалічных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Віды выданняў

Выданне: азначэнне паняцця. Відавая класіфікацыя выданняў.

Віды неперыядычных выданняў па мэтавым прызначэнні і характары інфармацыі. Мэтавае прызначэнне выданняў як адна з асноўных прымет класіфікавання перыядычных і неперыядычных выданняў, звязаная з выкананнем пэўных функцый. Асноўныя віды выданняў: афіцыйнае, навуковае, вытворча-практычнае, даведачнае, вучэбнае і інш., іх спецыфічныя рысы, чытацкі адрас. Характар інфармацыі ў выданні як раскрыццё іх жанравых асаблівасцей. Характарыстыка пэўных відаў выданняў па характары інфармацыі: вучэбных, навуковых, даведачных і інш.

### Асаблівасці дакументнага патоку па прыродазнаўстве, тэхніцы, сельскай гаспадарцы

Галіновыя асаблівасці дакументаў па прыродазнаўстве, тэхніцы і сельскай гаспадарцы. Відавы склад дакументаў у залежнасці ад мэтавага прызначэння, характару ўзнікнення, жанравых асаблівасцей. Спецыяльныя віды дакументаў і іх значэнне. Характарыстыка сучаснага дакументнага патоку па прыродазнаўстве, тэхніцы і сельскай гаспадарцы па тэматычных, відатыпалагічных, моўных прыметах. Асноўныя выдавецтвы, якія выдаюць літаратуру па прыродазнаўстве, тэхніцы і сельскай гаспадарцы ў Беларусі.

### Асаблівасці дакументнага патоку літаратурна-мастацкага комплексу

Спецыфічныя рысы дакументных рэсурсаў па тэматыцы літаратурна-мастацкага комплексу. Відавы склад дакументаў, ў тым ліку літаратурных твораў, у залежнасці ад складу асноўнага тэксту, мэтавага прызначэння, перыядычнасці, характару апублікавання і інш. Дыска-, фанаграфічныя, фільмаграфічныя рэсурсы ў дакументным патоку.

Характарыстыка сучаснага дакументнага патоку літаратурна-мастацкага комплексу па тэматыцы, відах, жанрах, моўнай, выдавецкай прымеце.

### Асаблівасці дакументнага патоку па сацыяльна-гуманітарных навуках

Сацыяльнае прызначэннне і задачы дакументаў па тэматыцы грамадскіх навук. Дыферэнцыяцыя сацыяльна-гуманітарных дакументаў па тэматыцы, светапогляднай накіраванасці, мове, выдавецкай прыналежнас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цi, характары апублiкавання, перыядычнасцi, умовах распаўсюджвання i iнш.

Вiды афiцыйных дакументаў органаў дзяржаўнай улады i кiравання, палiтычных партый, грамадскiх, мiжнародных арганiзацый. Сiстэма выданняў нарматыўна-прававых актаў Рэспублiкi Беларусь. Электронныя рэсурсы прававой iнфармацыi.

**Асаблiвасцi дакументнага патоку для дзяцей**

Значэнне дзiцячай лiтаратуры для выхавання i станаўлення асобы. Чытачы дзiцячай лiтаратуры i лiтаратуры для дзяцей. Дзейнасць дзяржаўных i недзяржаўных выдавецтваў па выданнi твораў беларускiх пiсьменнiкаў i перакладной лiтаратуры. Вiды неперыядычных i перыядычных выданняў для дзяцей.

Вiды выданняў для дзяцей па складу асноўнага тэксту, мэтавым прызначэннi i характары iнфармацыi, спосабу арганiзацыi твораў, паўторнасцi выпуску i iнш. Асаблiвасцi даведачных i навукова-пазнавальных выданняў.

**Бiблiяграфiчныя рэсурсы**

Агульнае паняцце аб бiблiяграфiчных рэсурсах. Уяўленне аб бiблiяграфiчнай прадукцыi як вынiку дзейнасцi розных бiблiяграфiчных цэнтраў. Разнастайнасць патрэбнасцей грамадства ў бiблiяграфiчнай iнфармацыi як аснова iснавання розных вiдаў, тыпаў, жанраў бiблiяграфiчнай прадукцыi.

Электронныя формы бiблiяграфiчных рэсурсаў. Вызначэнне паняццяў “база даных” (БД) i “банк даных” (БнД). Вiды БД: бiблiяграфiчныя, рэфератыўныя, поўнатэкставыя, фактаграфiчныя i iнш. Стварэнне i набыццё бiблiятэкамi разнастайных баз i банкаў даных на лакальных носьбiтах, арганiзацыя онлайнавага доступу да БД. Падыходы i праблемы камплектавання фондаў бiблiятэк электроннымi бiблiяграфiчнымi рэсурсамi. Генерыраванне Нацыянальнай кнiжнай палатай бiблiяграфiчнага банка даных дзяржаўнай бiблiяграфii, дэферэнцыраванага па вiдах друкаванай прадукцыi. БД Нацыянальнай бiблiятэкi Беларусi i рэспублiканскiх навуковых спецыяльных бiблiятэк краiны. Стварэнне БД абласнымi унiверсальнымi навуковымi бiблiятэкамi i публiчнымi бiблiятэкамi краiны. Выкарыстанне БД у разнастайных кiрунках бiблiятэчна-бiблiяграфiчнай работы бiблiятэкi.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крыніцы агульнай бібліяграфіі

Крыніцы агульнай бібліяграфіі, іх асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне. Сістэма бягучых дзяржаўных паказальнікаў Рэспублікі Беларусь. Агульная характарыстыка "Летапісу друку Беларусі", кумулятыўных выданняў – штогоднікаў "Кнігі Беларусі…", "Паказальніка бібліяграфічных дапаможнікаў", рыхтуемых Нацыянальнай кніжнай палатай. Напрамкі выкарыстання крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі ў рабоце бібліятэк.

Крыніцы агульнай рэтраспектыўнай (нацыянальнай) бібліяграфіі, іх функцыянальнае прызначэнне, метадычныя асаблівасці, сувязь з крыніцамі дзяржаўнай бягучай бібліяграфіі. Функцыі Нацыянальнай кніжнай палаты і буйнейшых бібліятэк краіны па падрыхтоўцы крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі. Рэтраспектыўныя паказальнікі беларускіх кніг, перыядычных выданняў, выданняў музычнай літаратуры, часопісных артыкулаў: агульная характарыстыка. Напрамкі выкарыстання крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі ў рабоце бібліятэк.

Крыніцы масавай бібліяграфічнай інфармацыі, іх адрозненне ад іншых крыніц агульнай бібліяграфіі. Удзел у падрыхтоўцы крыніц масавай бібліяграфічнай інфармацыі выдавецтваў, рэдакцый часопісаў і газет, кнігагандлёвых арганізацый, бібліятэк. Выдавецкія і кнігагандлёвыя бібліяграфічныя дапаможнікі: вызначэнне паняццяў. Арганізацыя іх выпуску. Класіфікацыя выдавецкіх і кнігагандлёвых бібліяграфічных дапаможнікаў па функцыянальна-мэтаваму прызначэнню (перспектыўныя, бягучыя, рэтраспектыўныя); па зместу адлюстроўваемых выданняў; па жанрах. Характарыстыка асноўных жанраў выдавецкіх і кнігагандлёвых бібліяграфічных дапаможнікаў: тэматычныя планы выпуску літаратуры; каталогі выдавецтваў; перыядычныя (бюлетэні, газеты) і неперыядычныя рэкламныя выданні і інш. Службовыя кнігагандлёвыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Выкарыстанне выдавецкіх і кнігагандлёвых бібліяграфічных дапаможнікаў у рабоце бібліятэкі.

## Крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі

Крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі: іх адрозненне ад крыніц агульнай бібліяграфіі.

Крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі: іх асаблівасці, функцыянальнае прызначэнне, арганізацыя выпуску. Сігнальны, рэфератыўны і аглядны ўзроўні сістэмы бягучага бібліяграфічнага інфармавання ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сферы навукі, вытворчасці і культуры. Сістэма бягучых бібліяграфічных выданняў навукова-дапаможнага характару універсальных і спецыяльных навуковых бібліятэк, органаў НТІ Беларусі. Рэтраспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі навукова-дапаможнага характару. Характарыстыка асноўных баз даных, генерыруемых бібліятэкамі краіны, як аснова для задавальнення запытаў і падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў.

Функцыянальнае прызначэнне крыніц папулярнай (рэкамендацыйнай) бібліяграфіі, арганізацыя іх выпуску. Роля папулярных (рэкамендацыйных) бібліяграфічных дапаможнікаў у сацыялізацыі асобы, адукацыйнай, выхаваўчай дзейнасці, фарміраванні культуры чытання. Характарыстыка асноўных звенняў сістэмы рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў у Рэспубліцы Беларусь, што выдзяляюцца па функцыянальна-мэтаваму, чытацкаму прызначэнню, зместу, жанрава-тыпалагічнай прымеце. Бюлетэнь "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як універсальная комплексная крыніца інфармавання аб лепшых выданнях і аналітычных матэрыялах, яго змястоўна-функцыянальная характарыстыка. Выпуск крыніц папулярнай (рэкамендацыйнай) бібліяграфіі абласнымі універсальнымі навуковымі бібліятэкамі, публічнымі бібліятэкамі. Напрамкі выкарыстання папулярных (рэкамендацыйных) бібліяграфічных дапаможнікаў у рабоце бібліятэк.

### Крыніцы краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі

Краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Вызначэнне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў па мэтавым і чытацкім прызначэнні, функцыянальна-мэтавай прымеце, змесце аб’ектаў бібліяграфавання, па метадах бібліяграфавання. Паняцце “сістэма краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў”. Бягучыя і рэтраспектыўныя навукова-дапаможныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Асноўныя тыпы і жанры рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў (універсальных тыпу “Што чытаць аб … краі”, календароў і знамянальных памятных дат, галіновых і тэматычных, персанальных і біябібліяграфічных дапаможнікаў.

Паказальнікі новай літаратуры аб вобласці (раёне, горадзе): функцыянальнае прызначэнне, метадычныя асаблівасці адбору дакументаў і групоўкі бібліяграфічных запісаў, склад даведачна-метадычнага апарату. Аптымальная перыядычнасць выпуску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Календары знамянальных і памятных дат: функцыянальнае прызначэнне, методыка складання (адбор дат і літаратуры; патрабаванні да тэкставых даведак, групоўкі матэрыялу; склад даведачна-метадычнага апарата) і выкарыстання.

## Раздзел 3 АРГАНІЗАЦЫЯ, ТЭХНАЛОГІЯ і МЕТОДЫКА БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ

### Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі

Даведачна-бібліяграфічны апарат (ДБА) бібліятэкі: азначэнне паняцця. Функцыянальнае прызначэнне ДБА. Структура ДБА: сістэма каталогаў і картатэк, даведачна-бібліяграфічны фонд, фонд выкананых даведак. Формы існавання розных частак ДБА. Залежнасць ДБА ад віду бібліятэкі, саставу карыстальнікаў, сацыяльна-эканамічных умоў рэгіёна, відавога складу фонду, інфармацыйнай сітуацыі ў рэгіёне.

Асаблівасці ДБА бібліятэк розных відаў. Асаблівасці ДБА ЦБС, адзінства і адрозненне ў складзе ДБА цэнтральнай бібліятэкі і бібліятэк-філіялаў; наяўнасць зводных частак ДБА; цэнтралізаваныя тэхналогіі фарміравання ДБА.

Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі. Азначэнне каталога і картатэкі, іх адрозненне. Задачы, якія стаяць перад сістэмай каталогаў і картатэк бібліятэкі.

Каталогі як крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі. Віды каталогаў і іх прызначэнне. Электронны каталог і яго перавагі перад карткавымі і друкаванымі. Павышэнне ролі зводных каталогаў у перыяд укаранення карпаратыўных тэхналогій і стварэння карпаратыўных сетак бібліятэк, віды зводных каталогаў. Асаблівасці каталогаў ЦБ і філіялаў.

Сістэма картатэк бібліятэкі. Асноўныя віды картатэк. Сістэматычная картатэка артыкулаў (СКА), яе прызначэнне і методыка складання. Тэматычныя, спецыяльныя (картатэка загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры, рэцэнзій, бібліяграфічных матэрыялаў, спецыяльных відаў навукова-тэхнічнай літаратуры і дакументацыі і інш.) і фактаграфічныя картатэкі ў бібліятэках розных тыпаў, асаблівасці іх вядзення ў традыцыйнай форме. Асаблівасці вядзення картатэк у ЦБ і філіялах.

Трансфармацыя картатэк у бібліяграфічныя, фактаграфічныя базы даных як сучасная тэндэнцыя вядзення гэтай часткі ДБА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі

***Даведачна-бібліяграфічны фонд*** (ДБФ) бібліятэкі: азначэнне, функцыянальнае прызначэнне, крыніцы камплектавання. Склад ДБФ. Актыўная і пасіўная часткі ДБФ. Асаблівасці арганізацыі ДБФ у бібліятэках.

***Афіцыйныя выданні і матэрыялы*** ў складзе ДБФ, іх прызначэнне, пошукавыя магчымасці, напрамкі выкарыстання ў дзейнасці бібліятэк. Поўнатэкставыя базы даных прававой інфармацыі.

***Даведачнае выданне*** як від выдання, яго асаблівасці. Відавы склад даведачнай літаратуры. Віды энцыклапедый па зместу, характару інфармацыі і чытацкаму прызначэнню. Даведнікі, іх класіфікацыя па прызначэнню і зместу. Слоўнікі як асаблівая група даведачных выданняў. Моўныя і тэрміналагічныя слоўнікі. Электронныя даведачныя выданні: іх характарыстыка і перавагі ў параўнанні з папяровымі выданнямі. Даведачныя рэсурсы ў Internet. Характарыстыка электронных онлайнавых энцыклапедый, слоўнікаў, даведнікаў.

***Бібліяграфічныя выданні***, іх віды; неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі; бібліяграфічныя БД у ДБФ бібліятэкі. Іх прызначэнне, камплектаванне і выкарыстанне ў рабоце бібліятэкі

***Фонд выкананых даведак***: прызначэнне, асаблівасці фарміравання і выкарыстання ў бібліятэках.

## Краязнаўчы ДБА бібліятэкі

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі: паняцце, функцыянальнае прызначэнне. Структура КДБА, формы існавання яго кампанентаў.

Цэнтральны сістэматычны краязнаўчы каталог (краязнаўчая картатэка) у ЦБ, краязнаўчыя картатэкі ў бібліятэках-філіялах ЦБС. Методыка фарміравання краязнаўчага сістэматычнага каталога (картатэкі). Крыніцы выяўлення і прынцыпы адбору матэрыялу; структура карткавага краязнаўчага каталога. Відавы склад адлюстроўваемых дакументаў. Выкарыстанне “Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь” для групоўкі бібліяграфічных запісаў. Вядзенне краязнаўчага каталога ў электронным рэжыме.

Картатэкі паэтычных твораў аб краі, фатаграфій, знамянальных і памятных дат, народных лекараў, майстроў і інш. Базы даных па краязнаўстве: бібліяграфічныя, фактаграфічныя, паўнатэкставыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд: яго прызначэнне, асаблівасці камплектавання, складу і арганізацыі. Фонд выкананых даведак краязнаўчай тэматыкі; адбор, захаванне і выкарыстанне даведак.

Узаемасувязь усіх частак КДБА паміж сабой і агульным ДБА бібліятэкі. Асаблівасці КДБА ў бібліятэках розных тыпаў.

**Складальніцкая бібліяграфічная работа бібліятэк**

Складанне бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў, тыпаў, жанраў, форм – важны напрамак дзейнасці бібліятэк па бібліяграфаванню дакументаў. Асноўныя этапы падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў: падрыхтоўчы, аналітычны, сінтэтычны, заключны. Характарыстыка асноўных працэсаў ***падрыхтоўчага этапа***: выбар і вывучэнне тэмы (зместу тэмы і яе бібліяграфічнай забяспечанасці); распрацоўка плана-праспекта (яго прызначэнне, адлюстраванне ў ім відавых, тыпалагічных, жанравых асаблівасцей будучага бібліяграфічнага дапаможніка, метадычных рашэнняў); выяўленне дакументаў (вызначэнне першасных і другасных, асноўных і дапаўняльных крыніц выяўлення дакументаў; тэхналогія і спосабы прагляду крыніц; вядзенне дзвюх картатэк).

Характарыстыка асноўных працэсаў ***аналітычнага этапа*** падрыхтоўкі бібліяграфічнага дапаможніка: агульны бібліяграфічны аналіз дакумента; падрыхтоўка бібліяграфічнага апісання; анатаванне або рэферыраванне (азначэнне анатацыі, рэферата, віды анатацый і рэфератаў, адрозненне анатацый і рэфератаў); індэксіраванне і прадметызацыя; складанне бібліяграфічнага запісу.

Характарыстыка асноўных працэсаў ***сінтэтычнага этапа*** складання бібліяграфічных дапаможнікаў. Канчатковы адбор дакументаў, яго віды і крытэрыі адбору. Абмежаваны (фармальны і змястоўны) адбор. Якасны адбор у навукова-дапаможных, адукацыйных, выхаваўчых і іншых мэтах. Групоўка бібліяграфічных запісаў (мэты групоўкі; спосабы групоўкі: фармальная, змястоўная, лагічная; простая і складаная). Залежнасць мэтазгоднасці выбару спосабу групоўкі ад зместу бібліяграфічнага дапаможніка, яго мэтавага і чытацкага прызначэння, аб'ёму, зместу і характару аб'ектаў бібліяграфавання.

Характарыстыка асноўных працэсаў ***заключнага этапа*** падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў. Даведачна-метадычны апарат бібліяграфічнага дапаможніка і асаблівасці яго падрыхтоўкі (прадмовы, уступнага артыкула, дапаможных паказальнікаў). Навуковае, літаратурнае і бібліія-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графічнае рэдагаванне дапаможніка. Афармленне дапаможніка перад здачай у друк. Патрабаванні да тытульнага ліста, зместу і іншых элементаў дапаможніка.

***Асаблівасці падрыхтоўкі папулярных (рэкамендацыйных) бібліяграфічных дапаможнікаў малых форм (***спісаў, лістовак, памятак). Актуальнасць тэматыкі як галоўнае патрабаванне да малых формаў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў, іх разнавіднасці (спіскі, лістоўкі, закладкі і інш.). Асаблівасці адбору і групоўкі дакументаў. Асаблівасці адбору дакументаў (па ступені складанасці, колькасці) для спіскаў "З чаго пачаць" і "Што чытаць далей". Значэнне знамянальных і памятных дат і іншых важнейшых падзей пры выбары тэм бібліяграфічных памятак. Характарыстыка структуры памяткі (прадмовы, біяграфічнай, фактаграфічнай даведкі, кароткага агляду важнейшай літаратуры).

**Бібліяграфічнае абслугоўванне**

***Бібліяграфічнае абслугоўванне***, азначэнне паняцця. Віды бібліяграфічнага абслугоўвання.

Уяўленне аб ***бібліяграфічным інфармаванні***, яго відах, асаблівасцях арганізацыі ў публічных бібліятэках. Азначэнне і сутнасць масавага бібліяграфічнага інфармавання. Асноўныя формы масавага бібліяграфічнага інфармавання: картатэкі новых паступленняў; бюлетэні (спісы) новых паступленняў у бібліятэкі (віды, формы спісаў, арганізацыйныя і метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі); выставы новых паступленняў (віды выстаў па характары экспануемай літаратуры, па месцы экспазіцыі; арганізацыйныя і метадычныя патрабаванні: перыядычнасць правядзення, разгортванне экспазіцыі выставы, групоўка матэрыялу, афармленне, стварэнне камфортных умоў для карыстальнікаў, паказчыкі ўліку праводзімых выстаў); вусныя бібліяграфічныя агляды новай літаратуры. "Дзень інфармацыі" як комплексная форма масавага бібліяграфічнага інфармавання: арганізацыя і тэхналогія падрыхтоўкі (адбор і сістэматызацыя дакументаў; падрыхтоўка і разгортванне экспазіцыі; рэклама і запрашэнне наведвальнікаў) і правядзення (прагляд і адбор матэрыялаў выставы наведвальнікамі, правядзенне разнастайных бібліятэчна-бібліяграфічных формаў, рэгістрацыя наведвальнікаў, афармленне заявак на атрыманне літаратуры, аналіз эфектыўнасці правядзення мерапрыемства).

***Групавое бібліяграфічнае інфармаванне***. Вызначэнне калектыўных абанентаў і вывучэнне іх інфармацыйных патрэбнасцей. Асноўныя формы групавога бібліяграфічнага інфармавання: тэматычныя выставы, тэматычныя спісы (бюлетэні) новых паступленняў, тэматычныя папкі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасье, ярмаркі інфармацыйна-бібліяграфічных прадуктаў і паслуг. "Дзень спецыяліста" як комплексная форма групавога бібліяграфічнага інфармавання. Асаблівасці методыкі падрыхтоўкі розных відаў (тэматычных, персанальных, выдавецкіх серый, інфармацыйных выданняў) бібліяграфічных аглядаў: вывучэнне тэмы, пошук і аналіз літаратуры, характарыстыка і групоўка дакументаў, рэдагаванне тэкстаў аглядаў. Асаблівасці правядзення аглядаў. Структура агляду: уступная частка; асноўная частка, яе змест і пабудова; метадычныя прыёмы характарыстыкі твораў; тэксты-звязкі, іх прызначэнне; заключная частка агляду.

***Індывідуальнае бібліяграфічнае інфармаванне***. Вызначэнне індывідуальных абанентаў і іх інфармацыйных патрэбнасцей. Сістэма выбарачнага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ) як найбольш эфектыўная форма індывідуальнага інфармавання. Патрабаванні да ВРІ і прынцыпы яго функцыянавання. Дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўнікоў (ДАК) як падсістэма ВРІ і яе спецыфіка.

***Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне***: азначэнне і асноўныя элементы. Разавы запыт, яго віды. Адказ на запыт, яго віды. Віды даведкі (тэматычная, удакладняльная, адрасная, фактаграфічная), сутнасць метадычнай кансультацыі, віды і прычыны адмоў. Пошук, бібліяграфічны і фактаграфічны, як элемент даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Арганізацыя даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў публічных бібліятэках. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: прыём запыту; устанаўленне кола крыніц, неабходных для аптымальнага задавальнення запыту; пошук бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі; афармленне даведкі; рэгістрацыя даведкі ў журнале ўліку; выдача ці накіраванне яе абаненту.

***Асаблівасці выканання розных тыпаў даведак***. Задавальненне тэматычных запытаў. Асаблівасці рэалізацыі розных працэсаў у ходзе выканання тэматычных запытаў: змест неабходных звестак, якія трэба атрымаць у працэсе прыёму запыту; неабходнасць знаёмства са зместам запыту; кола крыніц выяўлення дакументаў пры выкананні тэматычных даведак; выяўленне і адбор дакументаў у адпаведнасці з крытэрыямі, сфармуляванымі спажыўцом ў працэсе прыёму запыту; афармленне даведкі ў выглядзе тэматычнага спіса літаратуры або бібліяграфічнага паказальніка з адпаведнымі патрабаваннямі да бібліяграфічнага апісання дакументаў, групоўкі матэрыялу; асаблівасці ўліку тэматычных даведак; выдача тэматычнай даведкі абаненту; накіраванне копіі тэматычнай даведкі ў фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (фонд выкананых даведак). Асаблівасці выканання ўдакладняючых бібліяграфічных даве-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дак. Асаблівасці і асноўныя крыніцы выканання адрасна-бібліяграфічных і фактаграфічных запытаў. Выкананне даведак у аўтаматызаваным рэжыме.

***Краязнаўчае даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне***. Мэта, задачы даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў краязнаўчай інфармацыі, вывучэнне іх інфармацыйных патрэбнасцей. Тыпы даведак, крыніцы і тэхналогія іх выканання. Асноўныя тыпы бібліяграфічнага пошуку. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій пры ажыццяўленні даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў па краязнаўстве.

## Работа бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў

Азначэнне і змест паняццяў “інфармацыйная культура”, “інфармацыйная пісьменнасць”. Бібліяграфічная культура як састаўная частка інфармацыйнай культуры. Змест паняцця “бібліяграфічная культура”, павышэнне яе значэння ў сучасных умовах. Роля і задачы бібліятэк у фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Арганізацыйныя аспекты работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі; узаемадзеянне бібліятэк з навучальнымі установамі, сродкамі масавай інфармацыі, іншымі суб’ектамі сістэмы дакументных камунікацый. Асноўныя напрамкі работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі: у працэсе арганізаванага навучання ў вучэбных установах; у працэсе фарміравання інфармацыйнага асяроддзя ў бібліятэцы; у працэсе спецыяльна праводзімых мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

Класіфікацыя формаў фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі па розных прыметах: у залежнасці ад масавасці аўдыторыі; ад месца правядзення; ад спосабаў (сродкаў) перадачы і фарміравання бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў. Масавыя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры: наглядныя (розныя віды плакатаў, схемы-алгарытмы пошуку дакументаў; выставы даведачных, бібліяграфічных і іншых відаў інфармацыйных выданняў); вусныя (розныя віды аглядаў, лекцыі, кансультацыі); друкаваныя (даведачна-кансультацыйныя, метадычныя, інфармацыйныя выданні; выданні рэкламнага характару; электронныя формы); комплексныя (экскурсіі па бібліятэцы, Дні бібліяграфіі, Дні бібліятэкі). Групавыя і індывідуальныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры (бібліятэчна-бібліяграфічныя заняткі, кансультацыі, тэматычныя выставы, агляды і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Праграма**
**для паступаючых на скарочаны 4-х гадовы тэрмін навучання на ФЗН пасля заканчэння бібліятэчнага тэхнікума**

Праграма ўступных іспытаў падрыхтавана ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам «Сярэдняя спецыяльная адукацыя. Спецыяльнасць 2-23 01 31 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» і праграмай да Дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці 2-23 01 31 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», падрыхтаванай выкладчыкамі УА «Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А.С.Пушкіна».

У праграме выдзеляюцца чатыры раздзелы. Першы раздзел прысвечаны пытанням «Дакументазнаўства», дзе разглядаюцца асаблівасці сістэмы дакументных камунікацый, відавыя класіфікацыі дакументаў, выданняў. У другім раздзеле – «Бібліяграфазнаўства: тэарэтычныя пытанні» сканцэнтравана ўвага на пытаннях, звязаных з сучаснымі ўяўленнямі аб паняццях бібліяграфіі, бібліяграфазнаўстве, бібліяграфічнай інфармацыі, бібліяграфічнай дзейнасці, характарыстыцы інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў як сродкаў і вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці. У трэцім – «Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнай работы публічных бібліятэк» увага сканцэнтравана на арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, публічнай бібліятэцы, асноўных напрамках бібліяграфічнай работы бібліятэк у новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах: пытаннях арганізацыі даведачна-бібліяграфічнага апарата публічнай бібліятэкі, складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк, бібліяграфічнага абслугоўвання, фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў. Чацвёрты раздзел – «Спецыяльнае бібліяграфазнаўства» прысвечаны раскрыццю пытанняў інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння карыстальнікаў бібліятэк па пэўных галіновых комплексах (сацыяльна-гуманітарным; літаратурна-мастацкім; па прыродазнаўстве, тэхніцы і сельскай гаспадарцы) і дзіцячай літаратуры.

Акрамя арыентацыі на змест праграмы, ў час адказу на пытанні білета, абітурыент можа таксама выкарыстоўваць веды і ўменні, атрыманыя ў час практычнай работы ў бібліятэцы.

Іспыты праводзяцца ў вуснай форме. У білетах да іспытаў прапануюцца два пытанні: адно – з раздзелаў агульнага бібліяграфазнаўства, другое – з раздзелу спецыяльнага бібліяграфазнаўства. Пры выстаўленні адзнакі за адказ выкарыстоўваюцца патрабаванні, выкладзеныя ў метадычных указаннях «Крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў на ўступных экзаменах».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 1 ДАКУМЕНТАЗНАЎСТВА

### Сістэма дакументных камунікацый

Дакументная камунікацыя як падсістэма сацыяльнай камунікацыі. Жыццёвы цыкл дакумента ў сістэме інфармацыйных дакументных камунікацый.

Элементы сістэмы дакументнай камунікацыі як спосаб падрыхтоўкі і існавання дакумента ў грамадстве. Структура і склад падсістэмы дакументных камунікацый, грамадскае прызначэнне галінаў СДК, іх узаемасувязь. Агульная характарыстыка дакументнай дзейнасці. Бібліятэчная справа. Яе задачы па стварэнні ўмоў для захоўвання і распаўсюджвання дакументаў. Бібліятэкі як сховішча духоўнай памяці чалавецтва.

Бібліяграфічная справа. Яе роля ў арыентацыі чытачоў у патоку розных дакументаў. Бібліяграфія як пасрэднік паміж дакументам і карыстальнікам. Іншыя галіны дакументнай дзейнасці, звязанныя з жыццёвым цыклам дакумента.

### Арганізацыя кнігавыдання ў Беларусі

Нарматыуна-заканадаўчае забеспячэнне выдавецкай дзейнасці на Беларусі. Сучасныя кірункі кнігавыдання. Віды выдавецтваў і іх дыферэнцыяцыя па тэматыцы выдаваемай літаратуры, яе чытацкім адрасе, знакавай прыродзе інфармацыі, перыядычнасці. Выдавецтвы: дзяржаўныя, недзяржаўнай формы ўласнасці. Універсальныя і спецыялізаваныя. Кнігавыдавецкія фірмы. Рэдакцыйна-выдавецкія і літаратурна-выдавецкія агенцтвы. Малыя прадпрыемствы. Сумесныя прадпрыемствы з замежнымі фірмамі. Асноўныя выдавецтвы мастацкай, дзіцячай, навукова-тэхнічнай, афіцыйнай і інш. літаратуры. Асаблівасці чытання літаратуры рознымі катэгорыямі чытачоў. Сучасныя праблемы кнігавыдання.

### Віды дакументаў па розных прыметах

Азначэнне паняцця “дакумент”. Агульныя ўяўленні аб класіфікацыях. Суадносіны відавай і тыпалагічнай класіфікацыі дакументаў. Класіфікацыя дакументаў па семантычнай прымеце. Дакументаўтваральныя прызнакі класіфікавання, якія: адлюстроўваюць інфармацыйна-функцыянальную сутнасць дакумента; звязаны з матэрыяльнай складаючай дакумента; асаблівасцямі дакументавання; бытаваннем дакумента ў знешнім асяроддзі. Віды дакументаў, якія існуюць у СІДК. Іх класіфікацыя па характары інфармацыі, спосабе размнажэння, знакавай прыродзе, споса-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бе падрыхтоўкі тэксту, матэрыяльнай канструкцыі, у залежнасці ад носьбіту інфармацыі, тэрміну стварэння, юрыдычнага статуса і іншых прымет. Класіфікацыя дакументаў па канале ўспрыняцця інфармацыі, па мернасці запісу інфармацыі, па рэгулярнасці выхаду, па паходжанні, спосабе тыражавання, метадзе дакументавання, форме ўласнасці, па рэжымах доступу і інш.

## Віды выданняў

Выданне: азначэнне паняцця. Відавая класіфікацыя выданняў. ***Класіфікацыя выданняў па перыядычнасці.*** Перыядычныя выданні як адін з відаў серыяльных выданняў. Паняцце "серыяльныя выданні". Міжнародная і нацыянальная стандартызацыя відаў перыядычных выданняў. Класіфікацыя перыядычных выданняў. Віды газет па мэтавым прызначэнні. Характарыстыка па асобных прыметах: месцы выдання, чытацкім прызначэнні і інш. Віды часопісаў па асобных прыметах. Характарыстыка відавых асаблівасцей. Выданні, што прадаўжаюцца, іх агульная характарыстыка. Электронныя перыядычныя выданні і іх адметныя рысы, параўнанне з выданнямі на паперы. Календары і іх віды. Віды і характарыстыка бюлетэняў.

***Віды неперыядычных выданняў па мэтавым прызначэнні і характары інфармацыі.*** Мэтавае прызначэнне выданняў як адна з асноўных прымет класіфікавання перыядычных і неперыядычных выданняў, звязаная з выкананнем пэўных функцый. Асноўныя віды выданняў: афіцыйнае, навуковае, вытворча-практычнае, даведачнае, вучэбнае і інш., іх спецыфічныя рысы, чытацкі адрас. Характар інфармацыі ў выданні як раскрыццё іх жанравых асаблівасцей. Характарыстыка пэўных відаў выданняў па характары інфармацыі: вучэбных, навуковых, даведачных і інш.

## Выданні афіцыйных дакументаў

Вызначэнне паняццяў "афіцыйныя дакументы", "прававыя акты", "нарматыўныя" і "ненарматыўныя" прававыя акты. Віды прававых актаў, якія прымаюцца органамі дзяржаўнай улады і кіравання. Публікацыя новых нарматыўна-прававых актаў у перыядычных і неперыядычных выданнях. "Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь" як нарматыўны бюлетэнь усіх органаў улады. Бюлетэні асобных упаўнаважаных органаў дзяржаўнай улады і кіравання. Монавыданні нарматыўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прававых актаў, віды зборнікаў (у дапамогу законатворчаму працэсу "Храналагічны збор заканадаўства БССР", навуковыя, вучэбныя і інш.).

## Раздзел 2 БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПЫТАННІ

### Тэрміны "бібліяграфія" і "бібліяграфазнаўства", іх сутнасць і вызначэнне

Узнікненне і трансфармацыя паняцця "бібліяграфія". Сучасныя ўяўленні аб бібліяграфіі, бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліяграфічная практычная дзейнасць у структуры бібліяграфіі.

Бібліяграфазнаўства як сукупнасць навуковых ведаў аб бібліяграфіі. Характарыстыка асноўных раздзелаў бібліяграфазнаўства: тэорыі, гісторыі, арганізацыі, тэхналогіі (методыкі). Грамадскае значэнне бібліяграфіі.

### Бібліяграфічная інфармацыя: асноўныя формы яе замацавання і перадачы

Паняцце "бібліяграфічная інфармацыя"; адрозненне бібліяграфічнай інфармацыі ад іншых відаў сацыяльнай інфармацыі. Формы фіксавання і перадачы бібліяграфічнай інфармацыі: бібліяграфічнае паведамленне, бібліяграфічны запіс і яго элементы, бібліяграфічны дапаможнік. Несамастойныя формы бібліяграфічнай інфармацыі (прыкніжныя, прыартыкульныя спісы літаратуры і інш.).

### Функцыі бібліяграфіі

Асноўныя грамадскія функцыі бібліяграфіі ў дакументаграфічнай канцэпцыі (А.П.Коршунаў). Аб асноўных грамадскіх функцыях бібліяграфіі. Дваістасць бібліяграфічнай інфармацыі як адлюстраванне дваістасці адносін "дакумент – спажывец інфармацыі". Фарміраванне агульных, групавых, індывідуальных бібліяграфічных (дакументальна-бібліяграфічных) патрэбнасцей. Адпаведнасці паміж асноўнымі дакументальна-бібліяграфічнымі патрэбнасцямі і асноўнымі характарыстыкамі дакументаў. Пошукавая, камунікатыўная і ацэначная – асноўныя (сутнасныя) функцыі бібліяграфічнай інфармацыі. Знешнія функцыі бібліяграфічнай інфармацыі (інфармацыйная, выхаваўчая і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Відавая класіфікацыя бібліяграфіі

Дыферэнцыяцыя бібліяграфіі ***па грамадскім прызначэнні***. Асноўныя грамадскія функцыі (пошукавая, камунікатыўная і ацэначная) як падстава класіфікацыі бібліяграфіі па грамадскім прызначэнні. Выдзяленне А.П.Коршунавым агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі, іх функцыянальныя адметнасці. Характарыстыка відаў агульнай бібліяграфіі (дзяржаўнай, рэпертуарнай, масавай). Дыферэнцыяцыя відаў спецыяльнай бібліяграфіі (навукова-дапаможнай, папулярнай (рэкамендацыйнай) у сувязі са сферамі абслугоўвання.

Класіфікацыя бібліяграфіі па ***функцыянальна-мэтавым прызначэнні***. Функцыянальныя асаблівасці бягучай, рэтраспектыўнай і перспектыўнай бібліяграфіі. Перыядычнасць бягучых бібліяграфічных дапаможнікаў (бібліяграфічнага інфармавання). Абгрунтаванасць храналагічнага ахопу дакументнага масіву ў рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможніках.

Класіфікацыя бібліяграфіі па ***змесце аб'ектаў бібліяграфавання***. Характарыстыка паняццяў універсальнай, шматгаліновай, галіновай, комплекснай, персанальнай, краязнаўчай, краіназнаўчай бібліяграфіі, бібліяграфіі бібліяграфіі. Прыклады дапаможнікаў featured рознага зместу, выдадзеныя цэнтрамі бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

## Бібліяграфічная прадукцыя

Уяўленне аб бібліяграфічнай прадукцыі як выніку дзейнасці розных бібліяграфічных цэнтраў. Разнастайнасць патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве як аснова існавання розных відаў, тыпаў, жанраў бібліяграфічнай прадукцыі.

***Формы бібліяграфічных дапаможнікаў***. Разнастайнасць сучасных формаў існавання бібліяграфічнай інфармацыі (паведамленне, запіс, звесткі, дапаможнік, база даных). Бібліяграфічнае паведамленне як элемент бібліяграфічнай інфармацыі. Бібліяграфічны запіс як фіксаваная форма існавання бібліяграфічнага паведамлення. Бібліяграфічны дапаможнік як асноўны спосаб існавання і сродак распаўсюджання дакументаванай бібліяграфічнай інфармацыі. Формы бібліяграфічных дапаможнікаў (бібліяграфічныя выданні, несамастойныя выдавецкія формы, карткавыя формы, аўтаматызаваныя бібліяграфічныя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы).

***Тыпы бібліяграфічных дапаможнікаў.*** Асноўныя тыпы бібліяграфічных дапаможнікаў: бібліяграфічны паказальнік, спіс, агляд, паказальнікі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да выданняў, дапаможныя паказальнікі. Асаблівасці іх структуры, складу даведачна-метадычнага апарата.

***Жанры бібліяграфічных дапаможнікаў***. Метадычныя асаблівасці жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў: бібліяграфічных манаграфій, гутарак аб кнігах, “колаў чытання”, папулярных бібліяграфічных даведнікаў, планаў чытання і інш. Асаблівасці іх структуры, складу даведачна-метадычнага апарата.

## Крыніцы агульнай бібліяграфіі

Крыніцы агульнай бібліяграфіі, іх асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне. ***Сістэма бягучых дзяржаўных паказальнікаў Рэспублікі Беларусь.*** Агульная характарыстыка "Летапісу друку Беларусі", кумулятыўных выданняў – штогоднікаў "Кнігі Беларусі…", "Паказальніка бібліяграфічных дапаможнікаў", рыхтуемых Нацыянальнай кніжнай палатай. Напрамкі выкарыстання крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі ў рабоце бібліятэк.

***Крыніцы агульнай рэтраспектыўнай (нацыянальнай) бібліяграфіі***, іх функцыянальнае прызначэнне, метадычныя асаблівасці, сувязь з крыніцамі дзяржаўнай бягучай бібліяграфіі. Функцыі Нацыянальнай кніжнай палаты і буйнейшых бібліятэк краіны па падрыхтоўцы крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі. Рэтраспектыўныя паказальнікі беларускіх кніг, перыядычных выданняў, выданняў музычнай літаратуры, часопісных артыкулаў: агульная характарыстыка. Напрамкі выкарыстання крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі ў рабоце бібліятэк.

***Крыніцы масавай бібліяграфічнай інфармацыі,*** іх адрозненне ад іншых крыніц агульнай бібліяграфіі. Удзел у падрыхтоўцы крыніц масавай бібліяграфічнай інфармацыі выдавецтваў, рэдакцый часопісаў і газет, кнігагандлёвых арганізацый, бібліятэк. Выдавецкія і кнігагандлёвыя бібліяграфічныя дапаможнікі: вызначэнне паняццяў. Арганізацыя іх выпуску. Класіфікацыя ***выдавецкіх і кнігагандлёвых бібліяграфічных дапаможнікаў*** па функцыянальна-мэтаваму прызначэнню (перспектыўныя, бягучыя, рэтраспектыўныя); па зместу адлюстроўваемых выданняў; па жанрах. Характарыстыка асноўных жанраў выдавецкіх і кнігагандлёвых бібліяграфічных дапаможнікаў: тэматычныя планы выпуску літаратуры; каталогі выдавецтваў; перыядычныя (бюлетэні, газеты) і неперыядычныя рэкламныя выданні і інш. Службовыя кнігагандлёвыя бібліягра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фічныя дапаможнікі. Выкарыстанне выдавецкіх і кнігагандлёвых бібліяграфічных дапаможнікаў у рабоце бібліятэкі.

## Крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі

Крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі: іх адрозненне ад крыніц агульнай бібліяграфіі.

***Крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі***: іх асаблівасці, функцыянальнае прызначэнне, арганізацыя выпуску. Сігнальны, рэфератыўны і аглядны узроўні сістэмы бягучага бібліяграфічнага інфармавання ў сферы навукі, вытворчасці і культуры. Сістэма бягучых бібліяграфічных выданняў навукова-дапаможнага характару універсальных і спецыяльных навуковых бібліятэк, органаў НТІ Беларусі. Рэтраспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі навукова-дапаможнага характару. Характарыстыка асноўных баз даных, генерыруемых бібліятэкамі краіны, як аснова для задавальнення запытаў і падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў.

Функцыянальнае прызначэнне ***крыніц папулярнай (рэкамендацыйнай) бібліяграфіі,*** арганізацыя іх выпуску. Роля папулярных (рэкамендацыйных) бібліяграфічных дапаможнікаў у сацыялізацыі асобы, адукацыйнай, выхаваўчай дзейнасці, фарміраванні культуры чытання. Характарыстыка асноўных звенняў сістэмы рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў у Рэспубліцы Беларусь, выдзяляемых па функцыянальна-мэтаваму, чытацкаму прызначэнню, зместу, жанрава-тыпалагічнай прымеце. Бюлетэнь "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як універсальная комплексная крыніца інфармавання аб лепшых выданнях і аналітычных матэрыялах, яго змястоўна-функцыянальная характарыстыка. Выпуск крыніц папулярнай (рэкамендацыйнай) бібліяграфіі абласнымі універсальнымі навуковымі бібліятэкамі, публічнымі бібліятэкамі. Напрамкі выкарыстання папулярных (рэкамендацыйных) бібліяграфічных дапаможнікаў у рабоце бібліятэк.

## Крыніцы краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі

Вызначэнне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў па мэтавым і чытацкім прызначэнні, функцыянальна-мэтавай прымеце, змесце аб’ектаў бібліяграфавання, па метадах бібліяграфавання. Паняцце “сістэма краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў”. Бягучыя і рэтраспектыўныя навукова-дапаможныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Асноўныя тыпы і жанры рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфіч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных дапаможнікаў (універсальных тыпу “Што чытаць аб … краі”, календароў і знамянальных памятных дат, галіновых і тэматычных, персанальных і біябібліяграфічных дапаможнікаў.

## Раздзел 3 АРГАНІЗАЦЫЯ, ТЭХНАЛОГІЯ І МЕТОДЫКА БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК

### Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Арганізацыйна-ведамасная раздробленасць як асаблівая рыса арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. ***Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь***: Нацыянальная кніжная палата, бібліятэкі, выдавецтвы, кніжныя магазіны, органы НТІ, архівы, музеі, СМІ, асаблівасці выканання імі бібліяграфічных накірункаў дзейнасці.

***Нацыянальная кніжная палата Беларусі*** як нацыянальны бібліяграфічны цэнтр, яе задачы, функцыі, накірункі дзейнасці, сістэма бібліяграфічных выданняў.

***Бібліятэкі*** ў сістэме бібліяграфічнай дзейнасці краіны, асаблівасці іх функцыянавання як бібліяграфічных цэнтраў, дыферэнцыяцыя іх функцый у залежнасці ад ведамаснай, змястоўнай і тэрытарыяльнай прыналежнасці. Месца, роля і функцыі ***Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*** ў адлюстраванні бібліяграфічнымі сродкамі фонду сваёй бібліятэкі і бібліятэк краіны, стварэнні крыніц агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі па сацыяльна-гуманітарных навуках, рэспубліказнаўству на папяровых і электронных носьбітах, бібліяграфічным абслугоўванні карыстальнікаў бібліятэкі, фарміраванні іх бібліяграфічнай культуры, навукова-даследчай і навукова-метадычнай рабоце. Абласныя універсальныя навуковыя бібліятэкі як цэнтры краязнаўчай бібліяграфіі, інфармацыйныя цэнтры па культуры і мастацтву, навукова-метадычныя цэнтры ў рэгіёне, асноўныя напрамкі іх бібліяграфічнай дзейнасці. Месца публічных бібліятэк у сістэме бібліяграфічнага забеспячэння грамадства.

Узаемадзеянне бібліяграфічных цэнтраў – аб’ектыўная неабходнасць на шляху фарміравання адзінай інфармацыйнай сістэмы краіны. Асаблівасці ўзаемадзеяння бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў.

### Арганізацыя бібліяграфічнай работы ў публічнай бібліятэцы

Азначэнне паняцця “бібліяграфічная дзейнасць”. Асноўныя напрамкі бібліяграфічнай работы публічнай бібліятэкі: фарміраванне і вядзенне ДБА; падрыхтоўка для карыстальнікаў бібліятэкі бібліяграфічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнікаў розных відаў, жанраў, форм; бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў (бібліяграфічнае інфармаванне і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне); фарміраванне бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў; забеспячэнне доступу да інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў іншых бібліятэк, органаў НТІ.

Вызначэнне паняцця “арганізацыя бібліяграфічнай работы” як арганізацыі дзейнасці бібліяграфічнай службы ЦБС; як функцыі працэсу кіравання бібліятэкай. Асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай службы: наяўнасць бібліяграфічнага аддзела ў ЦБ (або сектара інфармацыі ў аддзеле абслугоўвання і інфармацыі), які выконвае асноўныя кірункі бібліяграфічнай дзейнасці, а таксама арганізацыйна-метадычныя і каардынацыйныя функцыі ажыццяўлення бібліяграфічнай работы ЦБС; удзел у выкананні бібліяграфічных працэсаў небібліяграфічных падраздзяленняў ЦБ і бібліятэк філіялаў. Размеркаванне абавязкаў паміж бібліяграфічным і небібліяграфічнымі аддзеламі, паміж ЦБ і бібліятэкамі-філіяламі, бібліёграфамі, замацаванне яго ў нарматыўных дакументах (палажэннях аб аддзелах, службовых інструкцыях), каардынацыя і кааперацыя бібліяграфічнай работы. Планаванне, улік і аналіз бібліяграфічнай работы ў ЦБС.

### Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі

***Даведачна-бібліяграфічны апарат*** (ДБА) бібліятэкі: азначэнне паняцця. Функцыянальнае прызначэнне ДБА. Структура ДБА: сістэма каталогаў і картатэк, даведачна-бібліяграфічны фонд, фонд выкананых даведак. Формы існавання розных частак ДБА. Залежнасць ДБА ад віду бібліятэкі, саставу карыстальнікаў, сацыяльна-эканамічных умоў рэгіёна, відавога складу фонда, інфармацыйнай сітуацыі ў рэгіёне.

Асаблівасці ДБА бібліятэк розных відаў. Асаблівасці ДБА ЦБС, адзінства і адрозненне ў складзе ДБА цэнтральнай бібліятэкі і бібліятэк-філіялаў; наяўнасць зводных частак ДБА; цэнтралізаваныя тэхналогіі фарміравання ДБА.

***Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі***. Азначэнне каталога і картатэкі, іх адрозненне. Задачы, якія стаяць перад сістэмай каталогаў і картатэк бібліятэкі.

Каталогі як крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі. Віды каталогаў і іх прызначэнне. Электронны каталог і яго перавагі перад карткавымі і друкаванымі. Павышэнне ролі зводных каталогаў у перыяд укаранення



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карпаратыўных тэхналогій і стварэння карпаратыўных сетак бібліятэк; віды зводных каталогаў. Асаблівасці каталогаў ЦБ і філіялаў.

***Сістэма картатэк бібліятэкі***. Асноўныя віды картатэк. Сістэматычная картатэка артыкулаў (СКА), яе прызначэнне і методыка складання. Тэматычныя, спецыяльныя (картатэка загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры, рэцэнзій, бібліяграфічных матэрыялаў, спецыяльных відаў навукова-тэхнічнай літаратуры і дакументацыі і інш.) і фактаграфічныя картатэкі ў бібліятэках розных тыпаў, асаблівасці іх вядзення ў традыцыйнай форме. Асаблівасці вядзення картатэк у ЦБ і філіялах.

Трансфармацыя картатэк у бібліяграфічныя, фактаграфічныя базы даных як сучасная тэндэнцыя вядзення гэтай часткі ДБА.

## Даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі

Даведачна-бібліяграфічны фонд (ДБФ) бібліятэкі: азначэнне, функцыянальнае прызначэнне, крыніцы камплектавання. Склад ДБФ. Актыўная і пасіўная часткі ДБФ. Асаблівасці арганізацыі ДБФ у бібліятэках.

***Афіцыйныя выданні і матэрыялы ў складзе ДБФ***, іх прызначэнне, пошуковыя магчымасці, напрамкі выкарыстання ў дзейнасці бібліятэк. Поўнатэкставыя базы даных прававой інфармацыі.

***Даведачнае выданне*** як від выдання, яго асаблівасці. Відавы склад даведачнай літаратуры. Віды энцыклапедый па змесце, характары інфармацыі і чытацкаму прызначэнню. Даведнікі, іх класіфікацыя па прызначэнню і зместу. Слоўнікі як асаблівая група даведачных выданняў. Моўныя і тэрміналагічныя слоўнікі. Электронныя даведачныя выданні: іх характарыстыка і перавагі ў параўнанні з папяровымі выданнямі. Даведачныя рэсурсы ў Internet. Характарыстыка электронных анлайнавых энцыклапедый, слоўнікаў, даведнікаў.

***Бібліяграфічныя выданні***, іх віды; неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі; бібліяграфічныя БД у ДБФ бібліятэкі. Іх прызначэнне, камплектаванне і выкарыстанне ў рабоце бібліятэкі

***Фонд выкананых даведак:*** прызначэнне, асаблівасці фарміравання і выкарыстання ў бібліятэках.

## Краязнаўчы ДБА бібліятэкі

Асаблівасці краязнаўчага ДБА бібліятэкі. Структура. Прызначэнне краязнаўчага сістэматычнага каталога (картатэкі). Методыка складання сістэматычнага краязнаўчага каталога (картатэкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крыніцы выяўлення і прынцыпы адбору матэрыялу. Відавы склад адлюстроўваемых дакументаў. Структура карткавага краязнаўчага каталога. Выкарыстанне “Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь” для групоўкі бібліяграфічных запісаў. Вядзенне краязнаўчага каталога ў электронным рэжыме.

## Складальніцкая бібліяграфічная работа бібліятэк

Складанне бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў, тыпаў, жанраў, формаў – важны напрамак дзейнасці бібліятэк па бібліяграфаванню дакументаў.

Асноўныя этапы падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў: падрыхтоўчы, аналітычны, сінтэтычны, заключны. Характарыстыка асноўных працэсаў ***падрыхтоўчага этапа***: выбар і вывучэнне тэмы (зместу тэмы і яе бібліяграфічнай забяспечанасці); распрацоўка плана-праспекта (яго прызначэнне, адлюстраванне ў ім відавых, тыпалагічных, жанравых асаблівасцей будучага бібліяграфічнага дапаможніка, метадычных рашэнняў); выяўленне дакументаў (вызначэнне першасных і другасных, асноўных і дапаўняльных крыніц выяўлення дакументаў; тэхналогія і спосабы прагляду крыніц; вядзенне дзвюх картатэк).

Характарыстыка асноўных працэсаў ***аналітычнага этапа*** падрыхтоўкі бібліяграфічнага дапаможніка: агульны бібліяграфічны аналіз дакумента; падрыхтоўка бібліяграфічнага апісання; анатаванне або рэферыраванне (азначэнне анатацыі, рэферата, віды анатацый і рэфератаў, адрозненне анатацый і рэфератаў); індэксіраванне і прадметызацыя; складанне бібліяграфічнага запісу.

Характарыстыка асноўных працэсаў ***сінтэтычнага этапа*** складання бібліяграфічных дапаможнікаў. Канчатковы адбор дакументаў, яго віды і крытэрыі адбору. Абмежаваны (фармальны і змястоўны) адбор. Якасны адбор у навукова-дапаможных, адукацыйных, выхаваўчых і іншых мэтах. Групоўка бібліяграфічных запісаў (мэты групоўкі; спосабы групоўкі: фармальная, змястоўная, лагічная; простая і складаная). Залежнасць мэтазгоднасці выбару спосаба групоўкі ад зместу бібліяграфічнага дапаможніка, яго мэтавага і чытацкага прызначэння, аб’ёму, зместу і характару аб’ектаў бібліяграфавання.

Характарыстыка асноўных працэсаў ***заключнага этапа*** падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў. Даведачна-метадычны апарат бібліягра-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

фічнага дапаможніка і асаблівасці яго падрыхтоўкі (прадмовы, уступнага артыкула, дапаможных паказальнікаў). Навуковае, літаратурнае і бібліяграфічнае рэдагаванне дапаможніка. Афармленне дапаможніка перад здачай яго ў друк. Патрабаванні да тытульнага ліста, зместу і іншых элементаў дапаможніка.

***Асаблівасці падрыхтоўкі папулярных (рэкамендацыйных) бібліяграфічных дапаможнікаў***. Мэтавае і чытацкае прызначэнне рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў, іх асноўныя тыпы і жанры, моўнастылявыя асаблівасці. Асаблівасці асноўных тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў. Метадычныя адметнасці рэкамендацыйных анатацый. Выкарыстанне разнастайных пазнавальных і інструкцыйна-метадычных звестак для стымулявання чытання. Якасны адбор – галоўны прынцып адбору дакументаў у рэкамендацыйныя дапаможнікі. Асаблівасці груповак бібліяграфічных запісаў.

## Бібліяграфічнае абслугоўванне

Бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне паняцця. Віды бібліяграфічнага абслугоўвання.

Уяўленне аб ***бібліяграфічным інфармаванні***, яго відах, асаблівасцях арганізацыі ў публічных бібліятэках. Азначэнне і сутнасць масавага бібліяграфічнага інфармавання. Асноўныя формы масавага бібліяграфічнага інфармавання: картатэкі новых паступленняў; бюлетэні (спісы) новых паступленняў у бібліятэкі (віды, формы спісаў, арганізацыйныя і метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі); выставы новых паступленняў (віды выстаў па характары экспануемай літаратуры, па месцы экспазіцыі; арганізацыйныя і метадычныя патрабаванні: перыядычнасць правядзення, разгортванне экспазіцыі выставы, групоўка матэрыялу, афармленне, стварэнне камфортных умоў для карыстальнікаў, паказчыкі ўліку праводзімых выстаў); вусныя бібліяграфічныя агляды новай літаратуры. "Дзень інфармацыі" як комплексная форма масавага бібліяграфічнага інфармавання: арганізацыя і тэхналогія падрыхтоўкі (адбор і сістэматызацыя дакументаў; падрыхтоўка і разгортванне экспазіцыі; рэклама і запрашэнне наведвальнікаў) і правядзення (прагляд і адбор матэрыялаў выставы наведвальнікамі, правядзенне разнастайных бібліятэчна-бібліяграфічных формаў, рэгістрацыя наведвальнікаў, афармленне заявак на атрыманне літаратуры, аналіз эфектыўнасці правядзення мерапрыемства).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Групавое бібліяграфічнае інфармаванне***. Вызначэнне калектыўных абанентаў і вывучэнне іх інфармацыйных патрэбнасцей. Асноўныя формы групавога бібліяграфічнага інфармавання: тэматычныя выставы, тэматычныя спісы (бюлетэні) новых паступленняў, тэматычныя папкі-дасье, ярмаркі інфармацыйна-бібліяграфічных прадуктаў і паслуг. "Дзень спецыяліста" як комплексная форма групавога бібліяграфічнага інфармавання. Асаблівасці методыкі падрыхтоўкі розных відаў (тэматычных, персанальных, выдавецкіх серый, інфармацыйных выданняў) бібліяграфічных аглядаў: вывучэнне тэмы, пошук і аналіз літаратуры, характарыстыка і групоўка дакументаў, рэдагаванне тэкстаў аглядаў. Асаблівасці правядзення аглядаў. Структура агляду: уступная частка; асноўная частка, яе змест і пабудова; метадычныя прыёмы характарыстыкі твораў; тэксты-звязкі, іх прызначэнне; заключная частка агляду.

***Індывідуальнае бібліяграфічнае інфармаванне***. Вызначэнне індывідуальных абанентаў і іх інфармацыйных патрэбнасцей. Сістэма выбарачнага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ) як найбольш эфектыўная форма індывідуальнага інфармавання. Патрабаванні да ВРІ і прынцыпы яго функцыянавання. Дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўнікоў (ДАК) як падсістэма ВРІ і яе спецыфіка

***Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне***: азначэнне і асноўныя элементы. Разавы запыт, яго віды. Адказ на запыт, яго віды. Віды даведкі (тэматычная, удакладняльная, адрасная, фактаграфічная), сутнасць метадычнай кансультацыі, віды і прычыны адмоў. Пошук, бібліяграфічны і фактаграфічны, як элемент даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Арганізацыя даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў публічных бібліятэках. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: прыём запыту; устанаўленне кола крыніц, неабходных для аптымальнага задавальнення запыту; пошук бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі; афармленне даведкі; рэгістрацыя даведкі ў журнале ўліку; выдача ці накіраванне яе абаненту.

***Асаблівасці выканання розных тыпаў даведак***. Задавальненне тэматычных запытаў. Асаблівасці рэалізацыі розных працэсаў у ходзе выканання тэматычных запытаў: змест неабходных звестак, якія трэба атрымаць у працэсе прыёму запыту; неабходнасць знаёмства са зместам запыту; кола крыніц выяўлення дакументаў пры выкананні тэматычных даведак; выяўленне і адбор дакументаў у адпаведнасці з крытэрыямі, сфармуляванымі спажыўцом ў працэсе прыёму запыту; афармленне даведкі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выглядзе тэматычнага спіса літаратуры або бібліяграфічнага паказальніка з адпаведнымі патрабаваннямі да бібліяграфічнага апісання дакументаў, групоўкі матэрыяла; асаблівасці ўліку тэматычных даведак; выдача тэматычнай даведкі абаненту; накіраванне копіі тэматычнай даведкі ў фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (фонд выкананых даведак). Асаблівасці выканання ўдакладняючых бібліяграфічных даведак. Асаблівасці і асноўныя крыніцы выканання адрасна-бібліяграфічных і фактаграфічных запытаў. Выкананне даведак у аўтаматызаваным рэжыме.

**Работа бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў**

Азначэнне і змест паняццяў "інфармацыйная культура", "інфармацыйная пісьменнасць". Бібліяграфічная культура як састаўная частка інфармацыйнай культуры. Змест паняцця "бібліяграфічная культура", павышэнне яе значэння ў сучасных умовах. Роля і задачы бібліятэк у фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Арганізацыйныя аспекты работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі; узаемадзеянне бібліятэк з навучальнымі установамі, сродкамі масавай інфармацыі, іншымі суб'ектамі сістэмы дакументных камунікацый. Асноўныя напрамкі работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі: у працэсе арганізаванага навучання у вучэбных установах; у працэсе фарміравання інфармацыйнага асяроддзя ў бібліятэцы; у працэсе спецыяльна праводзімых мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

Класіфікацыя формаў фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі па розных прыметах: у залежнасці ад масавасці аўдыторыі; ад месца правядзення; ад спосабаў (сродкаў) перадачы і фарміравання бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў. Масавыя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры: наглядныя (розныя віды плакатаў, схемы-алгарытмы пошуку дакументаў; выставы даведачных, бібліяграфічных і іншых відаў інфармацыйных выданняў); вусныя (розныя віды аглядаў, лекцыі, кансультацыі); друкаваныя (даведачна-кансультацыйныя, метадычныя, інфармацыйныя выданні; выданні рэкламнага характару; электронныя формы); комплексныя (экскурсіі па бібліятэцы, Дні бібліяграфіі, Дні бібліятэкі). Групавыя і індывідуальныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры (бібліятэчна-бібліяграфічныя урокі, кансультацыі, тэматычныя выставы, агляды і інш.).



РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 4 СПЕЦЫЯЛЬНАЕ БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

### Асаблівасці дакументнага патоку па прыродазнаўстве, тэхніцы, сельскай гаспадарцы

Галіновыя асаблівасці дакументаў па прыродазнаўстве, тэхніцы і сельскай гаспадарцы. Відавы склад дакументаў у залежнасці ад мэтавага прызначэння, характару ўзнікнення, жанравых асаблівасцей. Спецыяльныя віды дакументаў і іх значэнне. Перыядычныя і неапублікаваныя дакументы. Характарыстыка сучаснага дакументнага патоку па прыродазнаўстве, тэхніцы і сельскай гаспадарцы па тэматычных, відатыпалагічных, моўных прыметах. Асноўныя выдавецтвы, якія выдаюць літаратуру па прыродазнаўстве, тэхніцы, і сельскай гаспадарцы ў Беларусі.

### Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі

Асаблівасці і праярытэты развіцця сельскай гаспадаркі на Беларусі. Сістэма бібліятэк, якія ажыццяўляюць бібліяграфаванне і бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў. Дзейнасць Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі.

Сучасны стан бібліяграфічных рэсурсаў па сельскай гаспадарцы: навукова-дапаможныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы па сельскай гаспадарцы і арганізацыя доступу да іх.

Карыстальнікі бібліяграфічнай інфармацыі па сельскай гаспадарцы Формы давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да іх.

### Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне тэхнікі

Асаблівасці і праярытэты развіцця прамысловасці на Беларусі ў адпаведнасці з інавацыйнай праграмай. Сістэма бібліятэк, якія ажыццяўляюць бібліяграфаванне і бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў. Дзейнасць Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі.

Сучасны стан бібліяграфічных рэсурсаў па тэхніцы: навукова-дапаможныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы па тэхніцы і арганізацыя доступу да іх.

Карыстальнікі бібліяграфічнай інфармацыі па тэхніцы. Формы давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне прыродазнаўства**

Накірункі развіцця прыродазнаўства. Арганізацыя інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў па прыродазнаўстве ў Беларусі. Дзейнасць Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН.

Сучасны стан бібліяграфічных рэсурсаў па сельскай гаспадарцы: навукова-дапаможныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы па сельскай гаспадарцы і арганізацыя доступу да іх.

Карыстальнікі бібліяграфічнай інфармацыі па прыродазнаўстве. Формы давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да іх.

**Асаблівасці дакументнага патоку**
**літаратурна-мастацкага комплексу**

Спецыфічныя рысы дакументных рэсурсаў па тэматыцы літаратурна-мастацкага комплексу. Відавы склад дакументаў, ў тым ліку літаратурных твораў, у залежнасці ад складу асноўнага тэксту, мэтавага прызначэння, перыядычнасці, характары апублікавання і інш. Дыска-, фонаграфічныя, фільмаграфічныя рэсурсы ў дакументным патоку.

Характарыстыка сучаснага дакументнага патоку літаратурна-мастацкага комплексу па тэматыцы, відах, жанрах, моўнай, выдавецкай прымеце.

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне мастацтва**
**і мастацтвазнаўства**

Задачы і функцыі інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў па мастацтве і мастацтвазнаўстве ў дапамогу прафесійнай і непрафесійнай дзейнасці. Сучасны стан бібліяграфічных рэсурсаў па мастацтве і мастацтвазнаўстве: навукова-дапаможныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы па мастацтве і мастацтвазнаўстве.

Асноўныя карыстальнікі інфармацыі па мастацтве і мастацтвазнаўстве. Формы давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да іх.

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне мастацкай літаратуры**
**і літаратуразнаўства**

Задачы і функцыі інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў па мастацкай літаратуры і літаратуразнаўстве ў дапамогу прафесійнай і непрафе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сійнай дзейнасці (навуковай, творчай, адукацыйнай, кіраўніцкай і інш.). Дзейнасць бібліятэк па стварэнні інфармацыйна-бібліяграфічнай прадукцыі па мастацкай літаратуры і літаратуразнаўстве.

Сучасны стан бібліяграфічных рэсурсаў па мастацкай літаратуры і літаратуразнаўстве: навукова-дапаможныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы па мастацкай літаратуры і літаратуразнаўстве. Асноўныя карыстальнікі інфармацыі па мастацкай літаратуры і літаратуразнаўстве. Формы давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да іх.

### Асаблівасці дакументнага патоку і масіву па сацыяльна-гуманітарных навуках

Праяўленне паказчыкаў рассеяння, старэння, тэмпаў росту патоку і масіву дакументаў па сацыяльна-гуманітарных навуках (навуказнаўства, гісторыя, эканоміка як галіны максімальнага рассеяння). Характарыстыка нестарэючых дакументаў розных відаў і жанраў (канстытуцыі, кодэксы і інш.), павольна старэючых (статыстычныя даведнікі, энцыклапедыі і інш.) і актыўна старэючых (масава-палітычная літаратура і інш.) зон дакументнага патоку і масіву.

Відавая і зместавая разнастайнасць дакументнага патоку і масіву, дыферэнцыяцыя дакументаў па светапогляднай накіраванасці, месцы і мове выдання, месцы захавання.

### Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне сацыяльна-гуманітарных навук

Сетка устаноў Рэспублікі Беларусь, якія спецыялізуюцца на бібліяграфічным забеспячэнні сацыяльна-гуманітарнай інфармацыяй розных галін сацыягуманітарнай сферы: дзяржавы і права, эканомікі, палітыкі і інш. Асноўныя напрамкі іх дзейнасці.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь як цэнтры інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння сацыяльна-гуманітарнага комплексу; роля Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі ў інфармацыйным забеспячэнні спажыўцоў прававой інфармацыяй. Фарміраванне сеткі публічных цэнтраў прававой інфармацыі.

Адлюстраванне дакументаў сацыяльна-гуманітарнага зместу ў каталогах бібліятэк. Картатэкі, БД і бібліяграфічныя дапаможнікі сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі ў складзе ДБА бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Інфармацыйныя паслугі публічнай бібліятэкі па задавальненні запытаў у сферы сацыяльна-гуманітарных навук

Структура патрэбнасцей ў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі. Патрэбнасці ў дакументах рознага зместу, відаў, пэўнай светапоглядной накіраванасці і інш. Патрэбнасці ў бібліяграфічнай інфармацыі сацыяльна-гуманітарнага зместу.

Адлюстраванне сацыяльна-гуманітарных дакументаў у ДБА публічных бібліятэк. Метадычныя асаблівасці тэматычнага бібліяграфічнага пошуку дзеючых прававых актаў і актаў, прынятых у мінулыя перыяды; удакладнення бібліяграфічных звестак аб пэўных актах, іх фрагментах, відах выданняў прававых актаў. Пошук фактаграфічнай інфармацыі з тэкстаў нарматыўна-прававых актаў.

Метадычныя асаблівасці тэматычнага бібліяграфічнага пошуку па галінах сацыяльнай сферы і сацыягуманітарных навук. Методыка і асноўныя групы крыніц удакладняючага і адрасна-бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарных дакументаў.

Фактаграфічны пошук сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі.

Паслугі публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў ЦБС.

Падрыхтоўка бібліяграфічных прадуктаў (картатэк, аглядаў, спісаў і інш.) для масавых, групавых і індывідуальных формаў абслугоўвання спажыўцоў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў ЦБС.

## Асаблівасці дакументнага патоку для дзяцей

Значэнне дзіцячай літаратуры для выхавання і станаўлення асобы. Чытачы дзіцячай літаратуры і літаратуры для дзяцей. Дзейнасць дзяржаўных і недзяржаўных выдавецтваў па выданні твораў беларускіх пісьменнікаў і перакладной літаратуры. Віды неперыядычных і перыядычных выданняў для дзяцей.

Віды выданняў для дзяцей па складу асноўнага тэксту, мэтавым прызначэнні і характары інфармацыі, спосабу арганізацыі твораў, паўторнасці выпуску і інш. Асаблівасці даведачных і навукова-пазнавальных выданняў.

## Інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы па дзіцячай літаратуры

Задачы, функцыі, спецыфічныя рысы бібліяграфічных рэсурсаў для дзяцей і юнацтва, абумоўленыя задачамі выхавання, сацыяльна-псіхалагічнымі асаблівасцямі школьнікаў. Асноўныя карыстальнікі бібліягра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фічнай інфармацыі па дзіцячай літаратуры. Функцыянальнае прызначэнне крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі ў галіне дзіцячай літаратуры: сучасны стан.

Спецыфічныя рысы рэкамендацыйнай бібліяграфіі літаратуры для дзяцей. Рэкамендацыйна-бібліяграфічная інфармацыя для дзяцей як метад прапаганды літаратуры, сродак фарміравання чытацкіх інтарэсаў, метад кіравання чытаннем. Сістэма рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў па дзіцячай літаратуры, прынцыпы яе функцыянавання, структура, асноўныя цэнтры па падрыхтоўцы бібліяграфічных рэсурсаў дзіцячай літаратуры ў Беларусі і Расіі. Функцыянаванне рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі ў Internet.

## Спіс літаратуры

1. *ГОСТ 7.0—99*. Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Изд. офиц. – Введ. 2000-07-01. - Минск: Межгосударственный совет по стандартизации, метрологии и сетификации, 1999. – 23 с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Межгосударственный стандарт).

2. *ГОСТ 7.76—96*. Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения. – Введ. 01.01.98. – Минск: Изд-во стандартов, 1997. – 52 с.

3. *ГОСТ 7.1–2003*. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення. – Минск : Госстандарт Республики Беларусь : Белорусский государственный институт стандартизации и сертификации, 2004. – III, 48 с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу = Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе) (Межгосударственный стандарт).

4. *ГОСТ 7.80-2000*. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления. – Минск : Межгосударственный совет по стандартизации, метрологии и сертификации, 2001. – 7, [1] с., включая обложку. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Межгосударственный стандарт).

5. *ГОСТ 7.82-2001*. Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления. - Минск : Межгосударственный совет по стандартизации, метроло-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гии и сертификации, Б.г. (2002). – III, 22 с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Межгосударственный стандарт).

6. *ГОСТ 7.9–95* (ИСО 214-76). Реферат и аннотация. Общие требования. - Введ. 01.07.97.– Минск: Межгосударственный совет по стандартизации, метрологии и сетификации, 1996. – 7 с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу) (Межгосударственный стандарт).

7. *СТБ ГОСТ 7*.60–2005. Выданні. Асноўныя віды = Издания. Основные виды : тэрміны і азначэнні. – Мінск : Дзяржстандарт, [2005]. – IV, 54 с. – (Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе) (Государственный стандарт Республики Беларусь).

8. *Березкина, Н.Ю*. Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н.Ю.Березкина, Л.А.Авгуль, Б.Б.Невский. – Мінск: ИООО «Крассико-Принт», 2002. – 144 с.

9. *Бібліяграфічныя дапаможнікі Беларусі* ў 2001-2005 гадах: агляды. Дадатак да "Паказальніка бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі, 2005". – Мінск: Нац. кніжная палата Беларусі, 2006. – 56 с.

10. *Брежнева, В.В.* Информационное обслуживание: продукты и услуги, предоставляемые библиотеками и службами информации предприятий / В.В.Брежнева, В.А.Минкина – СПб., 2004. – С. 23 – 45; 105 – 116.

11.*Диомидова, Г.Н.* Библиографоведение: учебник для средних профессиональных учебных заведений / Г.П. Диомидова. – СПб.: Профессия, 2002. – 288 с. – (Серия "Библиотека").

12.*Зыгмантовіч, С.В.* Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці: вучэб. дапаможнік /С.В.Зыгмантовіч – Мінск: БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.

13.*Зыгмантовіч, С*. Бібліятэкі ў працэсе фарміравання інфармацыйнай культуры асобы / С.Зыгмантовіч // Бібл. свет. – 2002. – № 4. – С.29 - 31.

14.*Касінская, А.І.* Краязнаўчая бібліяграфія ва ўмовах інфармацыйных тэхналогій: традыцыі і навацыі / А.І.Касінская // Абласныя бібліятэкі: актуальныя аспекты дзейнасці: навук.-метад. выд. – Мінск: НББ, 2004. – С. 38–45.

15.*Концепция информационного взаимодействия библиотек* Беларуси: Разработана в рамках Программы развития единой компьютерной сети Республики Беларусь (НИКС РБ) и утверждена на засед. Респ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

библиотечного Совета при Мин-ве культуры 3.03.2000г. /Бел.библиотеч. ассоциация. – Мн.: ИООО «Красико- Принт», 2001. – 47 с.

16. *Коршунов, О.П.* Библиографоведение. Общий курс: учебник / О.П.Коршунов. – М.: Книжная палата, 1990. – 232 с.

17. *Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк*: метад. рэкамендацыі / Нац. б-ка Беларусі; склад. Р.М.Чыгірова, М.У.Сокал. – Мінск, 1994. – 102 с.

18. *Кушнаренко, Н.Н.* Документоведение: учебник / Н.Н.Кушнаренко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Киев: Знання, 2006. – 460 с.

19. *Ларьков, Н.С.* Документоведение: учеб. пособие / Н.С. Ларьков. – М.: Восток–Запад, 2006. – 367 с.

20. *Михлина, И.И.* Краеведческая библиография: науч.-метод. пособие / И.И.Михлина. – М.: Либерея-Бибинформ, 2008. – 176 с.

21. *Михлина, И.И.* Основные понятия краеведческой библиографии: учеб.-метод. пособие / И.И.Михлина. – М.: Профиздат, 2002. – 80 с.

22. *Справочник библиографа* / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб.: Профессия, 2002. – 528 с. - (Серия «Библиотека»).

23. *Справочник библиотекаря* / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – Изд. 2-е, исправл. и доп. - СПб.: Профессия, 2001. – 439 с. - (Серия «Библиотека»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ